Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

17 ВЕРАСНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 178 (28036) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Не падзялілі востраў з чайкамі**

СТАР. 3

Сямейная газета



**Падарожжа па сядзібах**



**Дапамога без абмежаванняў**

## СОНЦАМ ПАЦАЛАВАНЫЯ



Фота БЕЛТА.

**У Быхаўскім раёне паспела алыча позніх гатункаў. У філіяле «Макранскі» Быхаўскага кансервавага агароднінасушыльнага завода яе збіраюць, каб пасля зрабіць смачны джэм. Аграном сада Валянціна АЛАШКА з задавальненнем прымае ўдзел у збіранні сонечнага ўраджаю.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Віктар ВАЛЮШЫЦКІ, старшыня Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**

*«Пачаўся перыяд перадвыбарнай агітацыі. На гэтым этапе як ніколі важна ўмець расстаўляць прыярытэты. Думаю, параўноўваючы жыццё ў многіх нашых сумежных дзяржавах, усе шчаслівыя ад таго, што ў нас ёсць мір і яснае неба над галавой. Я лічу, гэта вялікае наша дасягненне. І, увогуле, кожны, прымаючы рашэнне на выбарах, павінен шанаваць тое, што створана ў нас, у суверэннай Беларусі, за апошнія 20 гадоў. Сёння Беларусь — дастойная краіна. І мы павінны старацца прымнажаць багацці, якія напрацавалі за перыяд суверэннай дзяржавы».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 17.09.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 17720,00 | ▼ |
| Еўра | 19947,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 268,80 | ▲ |
| Укр. грыўня | 811,91 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

■ Выбары-2015

## ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ ПАВІННА БЫЦЬ,

### а да дыстанцыйнага пакуль гатовы не ўсе

Лідзія Ярмошына адказала на пытанні выбаршчыкаў і журналістаў

**Краіна не баіцца экзітполаў, у нас яны праводзяцца кожныя прэзідэнцкія выбары. Пра гэта заявіла Лідзія ЯРМОШЫНА, старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні дзяржаўных рэферэндумаў, падчас анлайн-канферэнцыі ў Беларускім тэлеграфным агенцтве. Старшыня ЦВК таксама патлумачыла, чаму датэрміновае галасаванне павінна быць, і выказала сваё меркаванне наконт працы міжнародных назіральнікаў.**

### ПРАВОДЗІЦЬ ЭКЗІТПОЛЫ МОГУЦЬ НЕ ЎСЕ

— Мяне ўжо папрасіў узгадніць мерапрыемства, хоць я не абавязана тое рабіць, Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі, — адзначыла Лідзія Ярмошына, адказваючы на пытанне пра экзітполы. — Адразу магу сказаць: любы чалавек, любая група грамадзян праводзіць падобнае мерапрыемства не можа. Для гэтага трэба атрымаць адпаведную акрэдытацыю ў камісіі, якая ўтворана пры Савеце Міністраў, але працуе на базе Акадэміі навук. Яе ўзначальвае прафесар Катляроў.

СТАР. 2

■ Спецыяльны рэпартаж

## ВЫХАД НА ПРЫРОДУ

### Як беспрацоўныя асвойваюць грамадскія работы

**Зранку а палове восьмай ля ўвахода ў Цэнтральны батанічны сад НАН ужо ўтварылася чарга. Не цікаўных наведвальнікаў — беспрацоўных. Незанятыя грамадзяне, што стаяць на ўліку ў службе занятасці, павінны два дні ў месяц выходзіць на грамадскія работы. Дваццаць чалавек (адны мужчыны!), што чакаюць у варотах батанічнага сада, вырашылі прысвяціць сённяшнія восем гадзін прыродзе. Чаму некаторыя жыхары сталіцы месяцамі сядзяць без працы і не трапляюць на вакансіі, заяўленыя на біржы? Назіраючы за тым, як праходзяць грамадскія работы, мы высвятлялі і гэтае пытанне.**

### ПА ЛАПАЦЕ КОЖНАМУ

Найбольш напружаны сезон у батанічным садзе — з канца сакавіка да пачатку лістапада. Працы ў гэтыя месяцы хапае. Тым, хто прыходзіць на грамадскія работы, даручаюць добраўпарадкаваць тэрыторыю і даглядаць калекцыі раслін.

— Сёлета шмат людзей да нас запісваецца, — кажа **намеснік дырэктара па навуковай працы Іван ВАЛАДЗЬКО**. — Але мы не можам прыняць больш за 22 чалавекі, таму што грошы на аплату іх працы — гэтая сума абмежавана — выдаткоўвае ўпраўленне занятасці. З беспрацоўнымі афармляем дагавор, залічваем у штат на два дні, потым звальняем. Хоць некаторыя застаюцца ў нас. Адна з жанчын, з вышэйшай адукацыяй, цяпер у лабараторыі працуе.

З якога часу батанічны сад прымае мінчукоў на грамадскія работы, Іван Казіміравіч ужо і не памятае. «Больш за дзесяць гадоў, напэўна». Па дарожцы, абсаджанай чорнай рабінай, мы ідзём да брыгады беспрацоўных, што наводзяць парадак у ландшафтным парку. Мужчыны з лапатамі чысцяць тэрыторыю ад парасніку і самасеву.

— Гэта «пустазелле» для дадзенага месца, — тлумачыць нам **старшы навуковы супрацоўнік лабараторыі інтрадукцыі драўняных раслін і загадчык дэндрарыя Міхаіл РУДЗЕВІЧ**. — Ландшафтны парк павінен мець сваё аблічча, а самасеў робіць тэрыторыю непраходнай і менш прывабнай. Такія «чысткі» праводзяць раз у пяць гадоў. Потым на ўчастак можна падсадзіць расліны, якія найбольш упішуцца ў пейзаж. Вунь там, на ўскрайку, у нас ёсць 80-гадовыя сосны, яны стаяць даволі свабодна, хопіць месца яшчэ для некалькіх дрэў. А ў бярозавым гаі добра б глядзелася якое-небудзь кустоўе, што ў розныя сезоны ўпрыгожвала б гай сваім цвіценнем, афарбоўкай лістоты ці формай.

Дадатковыя пары рабочых рук, якімі перыядычна забяспечвае батанічны сад служба занятасці, тут не лішнія. Хоць, уздыхае Міхаіл Мікалаевіч, лепш было б наняць прафесіянала, які б сам ведаў, як дагледзець пэўную мясцовасць. Абслугоўвага персаналу тут сапраўды не хапае.



Фота Надзеі БУЖАН.

**На 93 гектарах працы ўсім хопіць.**

### ГУЛЬТАЁЎ — НА НАТУРАЛЬНУЮ ГАСПАДАРКУ

Сёння ў распараджэнні Міхаіла Мікалаевіча адзінаццаць чалавек. Ёсць старанныя работнікі, якія спрытна выкарчоўваюць карані, ёсць лайдакі, што капаюцца на адным месцы, цягнучы час.

СТАР. 5

# ДАТЭРМІНОВАЕ ГАЛАСАВАННЕ ПАВІННА БЫЦЬ...

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Атрымаўшы акрэдытацыю (а для яе трэба абавязкова прадаставіць прафесійныя доказы таго, што члены каманды валодаюць методыкай правядзення сацыялагічных апытанняў), можна праводзіць гэтае мерапрыемства. Члены каманды, якія будуць праводзіць апытанні, павінны мець адпаведныя бэйджы, дакументы, што пацвярджаюць іх права на вядзенне дадзенай кампаніі.

Кажучы пра сваё стаўленне да такіх апытанак выбаршчыкаў, Лідзія Ярмошына прызналася, што схільна давяраць ім.

— Я лічу, калі гэтае мерапрыемства праводзіцца сумленна і ў адпаведнасці з агульнапрынятымі методыкамі, то яно сапраўды дае вынік, блізкі да таго, які потым пакажуць выбарчыя камісіі.

## ТРЭБА ЗМАГАЦЦА ЗА ГАЛАСЫ

Гаворачы пра датэрміновае галасаванне, старшыня ЦВК падкрэсліла, што сцвярджэнне, нібыта датэрміновае галасаванне сябе зжыло, абсалютна надуманае.

— У прынцыпе, да разгляду падобных прапаноў часам звяртаецца Расійская Федэрацыя: раней у іх датэрміновае галасаванне выкарыстоўвалася толькі ў цяжкадаступных раёнах, напрыклад падчас экспедыцый, — заўважыла Лідзія Ярмошына. — Цяпер разглядаецца пытанне адмены датэрміновага галасавання для звычайных грамадзян. Думаю, нам трэба змагацца за галасы выбаршчыкаў, а не ліквідаваць магчымасці, каб людзі маглі прагаласаваць у зручны час і ў зручнай для іх форме.

Што тычыцца падліку галасоў, то, звярнула ўвагу старшыня Цэнтральнай камісіі, цяпер у законе з'явілася норма, якая прама ўстанаўлівае, што галасы — выбарчыя бюлетэні па ўсіх скрынях для галасавання — павінны лічыцца асобна.

— Падлік галасоў пачынаецца з таго, што ўскрываецца першая скрыня для датэрміновага галасавання і падлічваюцца ўсе бюлетэні, якія знаходзяцца ў ёй. Потым ускрываюцца тыя, што выкарыстоўваліся пры наведванні выбаршчыкаў дома. Апошняй ускрываецца скрыня, якая выкарыстоўвалася ў дзень выбараў. Так што паасобная працэдура падліку галасоў дазваляе ўлічваць і рабіць галосны тую колькасць выбаршчыкаў, якая прымала ўдзел у датэрміновым галасаванні.

Як паведаміла Лідзія Ярмошына, яна галасуе датэрмінова, паколькі ў дзень выбараў — заўсёды на працы.

Што да дыстанцыйнага галасавання, то, па словах старшыні Цэнтральнай камісіі, частка нашага грамадства ўжо гатова галасаваць праз інтэрнэт, лістамі або яшчэ неяк, а частка не.

— Вядома, моладзь, якая ўмее карыстацца інтэрнэтам і адчувае сябе там вельмі камфортна, гатова галасаваць дыстанцыйна, — заўважыла яна. — Што тычыцца старэйшага пакалення, пажылых людзей, думаю, яны не гатовы да гэтага. Але менавіта гэтая катэгорыя з'яўляецца самымі актыўнымі выбаршчыкамі, таму трэба арыентавацца і на іх. Я думаю, што перад пераходам на такую форму галасавання трэба правесці вельмі якасныя грамадскія апытанні, а можа быць, і кансультатыўны рэферэндум, каб высветліць меркаванне выбаршчыкаў, таму што проста перайсці да гэтай формы галасавання было б непрадумана.

## НАЗІРАЛЬНІКАЎ БОЛЬШ ЧЫМ ДАСТАТКОВА

Ці дастаткова ў нас назіральнікаў? Лідзія Ярмошына ўпэўнена, што больш чым дастаткова.

— Акрамя таго, у нас яшчэ будзе шмат незалежных назіральнікаў. Гэта палітыкі, замежныя грамадзяне, якіх запрасіць ужо ў самастойнай якасці Рэспубліка Беларусь. Будуць мае калегі. Хачу пахваліцца, што, у прынцыпе, усе выбаркамы, акрамя Эстоніі, якія існуюць і працуюць на тэрыторыі краін былога Савецкага Саюза, адгукнуліся і прыязджаюць да нас на выбары. З іх толькі старшынь цэнтрвыбаркамаў — 10 чалавек, я — адзінаццатая. У нас вельмі высокае, шырокае і аўтарытэтнае прадстаўніцтва.

Падчас анлайн-канферэнцыі карэспандэнт БелТА пацікавіўся ў старшыні ЦВК наконт шанцаў, што па выніках гэтай выбарчай кампаніі нейкая шаблоннасць падыходаў у адносінах да Беларусі з боку АБСЕ будзе зламана.

— Мне б вельмі хацелася адказаць станоўча, — прызналася Лідзія Ярмошына. — Але я не магу рабіць ацэнку за ўсім іншых людзей, у якіх задачы адрозныя ад маіх. Мы працавалі і будзем працаваць, як звычайна, на тое, каб ацэнка выбараў была са знакам «плюс». Гэта значыць, каб у выніку быў пазначаны прагрэс, а не рэгрэс. Але канчатковае рашэнне будзе за міжнароднымі назіральнікамі. Акрамя гэтага, я б хацела звярнуць увагу, што ў Беларусі існуе шэраг палітычных сіл, якія працуюць на адмоўную ацэнку. Гэта найперш апазіцыйныя палітыкі, асабліва тыя, хто не змог удзельнічаць у выбарах ці выбыў з першага этапу выбарчай кампаніі, не здолеўшы сабраць патрэбную колькасць подпісаў. Для іх адмоўныя вынікі з'яўляюцца станоўчым момантам. На гэта яны і будуць працаваць.

## КАМПАНІЯ ПРАХОДЗІЦЬ МЯККА

Гаворачы пра пазітыўныя моманты гэтай выбарчай кампаніі ў параўнанні з папярэдняй, старшыня Цэнтральнай камісіі заўважыла, што ніякіх засмучальных сітуацый пакуль няма.

— Мне здаецца, што гэтая кампанія значна больш ветлівая, чым выбарчая кампанія 2010 года. Нават відавочныя фальсіфікацыі, якія былі дапушчаны пры зборы подпісаў у дачыненні да прэтэндэнта Цярэшчанкі, не могуць параўнацца з тымі фальсіфікацыямі, якія дапусціў патэнцыйны прэтэндэнт з Віцебска (удзельнік этапу збору подпісаў кампаніі 2010 года). Ён наогул прадставіў амаль што ліпавыя падпісныя лісты. Група Цярэшчанкі спрацавала нашмат добрасумленней.

Як адзначыла Лідзія Ярмошына, яе парадаваў мяккі характар вядзення кампаніі.

— Найбольш за ўсё парадавалі мясцовыя ўлады. Не толькі ў Мінску, але і ў невялікіх гарадах і вёсках былі прадастаўлены дэмакратычныя ўмовы для збору подпісаў. У 2010 годзе гэтых месцаў для пікетаў, калі гэта тычылася не Мінска, а якога-небудзь невялікага горада і нават абласнога цэнтра, было нашмат менш, абмежаванняў дзейнічала значна больш. У гэты раз умовы былі лепшымі. Я б сказала, што лепшыя і рашэнні па месцах для вядзення сустрэч.

Старшыня ЦВК прызналася, што з нецярпеннем чакае выступленняў кандыдатаў.

— Мне здаецца, што ў гэты раз яны будуць сапраўды несці станоўчую думку, станоўчы меседж выбаршчыкам. У 2010 годзе і крытыка, і агітацыя шэрагу кандыдатаў насілі дэструктыўны характар і былі накіраваны, у прынцыпе, на дэстабілізацыю становішча ў краіне.

**Надзея АЛЕКСАНДРОВІЧ.**

# ФОНДЫ КАНДЫДАТАЎ

## Удзельнікі выбарчай гонкі адкрылі спецыяльныя рахункі ў банках

**Адпаведна з Выбарчым кодэксам Беларусі для фінансавання выдаткаў па перадвыбарнай агітацыі спецыяльныя выбарчыя рахункі адкрылі ўсе чатыры кандыдаты ў Прэзідэнты Рэспублікі Беларусь. Пра гэта паведамляе Цэнтральная камісія па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў на сваім афіцыйным сайце.**

Таццяна Караткевіч, Мікалай Улаховіч і Сяргей Гайдукевіч адкрылі спецыяльныя рахункі яшчэ на этапе вылучэння ў кандыдаты. Па звестках ЦВК на 26 жніўня на рахунак Таццяны Караткевіч было залічана Br12,8 млн, амаль усе яны былі накіраваны на аплату выдаткаў, звязаных са зборам подпісаў па вылучэнні яе ў кандыдаты. На рахунак Сяргея Гайдукевіча тады ж паступіла каля сямі мільёнаў рублёў, на рахунак Мікалая Улаховіча — трохі больш за 300 тысяч. Пасля рэгістрацыі кандыдатаў грошы, па інфармацыі ЦВК на 16 верасня, паступілі толькі на рахунак Таццяны Караткевіч — 400 тысяч рублёў і Аляксандра Лукашэнкі — 202 млн 360 тысяч рублёў.

Крыніцай фарміравання выбарчага фонду кандыдата з'яўляюцца ўласныя сродкі, памер якіх абмежаваны 9 тысячамі базавых велічынь (на сёння гэта — 1 млрд 620 млн рублёў), а таксама добраахвотныя ахвяраванні грамадзян Рэспублікі Беларусь. Памер ахвяраванняў грамадзяніна не можа перавышаць 20 базавых велічынь. Яшчэ адна дазволеная крыніца паступленняў — пералічэнні ад юрыдычных асоб. Памер такіх абмежаваны 50 базавымі велічынямі (адна базавая зараз складае Br180 тысяч).

Забараняецца пералічэнне ў выбарчыя фонды бюджэтных сродкаў, а таксама грошай замежнымі дзяржавамі і арганізацыямі, міжнароднымі арганізацыямі, замежнымі грамадзянамі, асобамі без грамадзянства, арганізацыямі, заснавальнікамі (удзельнікамі, уласнікамі маёмасці) якіх з'яўляюцца замежныя дзяржавы, замежныя арганізацыі, міжнародныя арганізацыі, замежныя грамадзяне і асобы без грамадзянства.

Нельга таксама ахвяраваць грошы на перадвыбарную агітацыю кандыдатаў арганізацыям, якія атрымалі на працягу папярэдняга года замежную дапамогу, калі яны яе не вярнулі або загадзя не пералічылі ў даход дзяржавы. Не дапускаецца ахвяраванне з боку непаўналетніх асоб, дзяржаўных органаў і органаў самакіравання, арганізацый, якія фінансуюцца з бюджэту, а таксама арганізацый, якія былі зарэгістраваныя менш чым за год да ўнясення ахвяравання. Не прымаюцца ахвяраванні ад дабрачынных, рэлігійных арганізацый і ананімаў. Дарэчы, ананімам лічыцца не толькі той, хто не ўказаў сваё прозвішча, імя і імя па бацьку, але і той, хто не паведаміў пра дату нараджэння, месца жыхарства, пашпартныя даныя (або ўліковы нумар плацельшчыка, найменне, банкаўскія рэквізіты, юрыдычны адрас арганізацыі).

Апошні дзень прыёму ахвяраванняў у выбарчы фонд кандыдата ў Прэзідэнты — 10 кастрычніка ад грамадзян і 9 кастрычніка — ад юрыдычных асоб. Сродкі выбарчага фонду кандыдата могуць выкарыстоўвацца на аплату выдаткаў, звязаных з перадвыбарнай агітацыяй: арэнда, транспарт, сувязь, друкаваныя матэрыялы, эфірны час, публікацыі ў СМІ, кансультацыі і агітацыя, канцылярскія тавары і іншае.

Згодна з заканадаўствам, максімальная сума ўсіх выдаткаў са сродкаў выбарчага фонду не можа перавышаць 9 тысяч базавых велічынь.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**
*medvedeva@zviazda.by*

■ Блізкая ўлада

# ДЛЯ АДНЫХ СУП РЭДКІ, ДЛЯ ІНШЫХ ЖЭМЧУГ ДРОБНЫ



**У асноўным на чарговы прыём грамадзян да старшыні Мінаблвыканкама Сямёна ШАПІРЫ прыйшлі жыхары «праблемнага» Мінскага раёна. Праблемнага ў тым плане, што тут пабудавана 20 тысяч індывідуальных прыватных дамоў. Але не ўсе гаспадары могуць засяліцца ў «звітае гняздзечка», паколькі ў адных не падведзена святло, у іншых — вада, у некаторых — газ.**

— Бюджэт вобласці складае 18 трлн рублёў, бюджэт сярэдняга раёна — 400 млрд рублёў. Для ўладкавання сетак неабходна 4 трлн рублёў. Вядома, гэта непасільная нагрузка. Акрамя таго, трэба плаціць зарплаты медыкам, настаўнікам, работнікам культуры, пенсіі. Таму пры стварэнні кааператываў за кошт дзяржавы будуць падводзіцца камунікацыі толькі шматдзетным сем'ям, астатнім катэгорыям грамадзян — за свой кошт, — падкрэсліў старшыня аблвыканкама.

Падчас прыёму сустракаліся і заяўнікі, якія лічаць, што дзяржава не дадае тое, што ім належыць. У прыватнасці, мужчына з вёскі Тарасава Мінскага раёна. У сям'і гадуецца чацвёра дзяцей. Усе малыя з гэтага населенага пункта дабіраюцца ў школу ў Мінск, паколькі тут няма сваёй навучальнай установы. Школьнікі аплачваюць праезд у прыгарадным транспарце са сваёй кішэні, дакладней з бацькоўскай. Здаралася, кантралёры спрабавалі высадзіць малых «зайцоў» з аўтобуса. Заяўнік прывёў прыклад, што сталічныя школьнікі ездзяць да месца вучобы грамадскім транспартам бясплатна. Тут нібыта прысутнічае элемент дыскрымінацыі вясковых дзяцей. Але, як растлумачыла начальнік упраўлення адукацыі Мінаблвыканкама Галіна Казак, правы на бясплатны праезд маюць школьнікі, што жывуць у сельскай мясцовасці і вучацца ў сельскіх школах, таксама, як іх равеснікі, што пражываюць у горадзе і наведваюць гарадскія навучальныя ўстановы. Атрымліваецца, паводле заканадаўства, усё правільна. Разам з тым Сямён Шапіра даручыў Галіне Казак выйсці ў Савет Міністраў з прапановай разгледзець пытанне аб бясплатным праездзе сельскіх школьнікаў да месца вучобы ў горадзе.

Здавалася б, тэма на гэтым вычарпана. Ды толькі не для заяўніка. Яго абурае, што шматдзетнай сям'і не аказалі матэрыяльную дапамогу (менавіта фінансавую), каб сабраць дзяцей да новага навучальнага года. Толькі аднаму з выхаванцаў, таму, што сёлета ўпершыню пайшоў у школу, дапамаглі сабраць партфель. Грамадзяніну растлумачылі, што найперш гэта тычыцца тых, хто пойдзе ў першы клас.

Акрамя таго, наведвальнік прасіў, каб да яго дома падвялі бясплатную каналізацыю. Але атрымаў адмову. Як адзначыў старшыня Мінаблвыканкама, трэба дамаўляцца з суседзямі, жыхарамі населенага пункта і ладкаваць камунікацыі за асабістыя сродкі.

Мужчына працуе юрыстам (яго заробак — 6 млн рублёў), жонка ў дэкрэтным водпуску, атрымлівае 3 млн «дзіцячых». «Грошай не хапае. Была нават запазычанасць за камунальныя паслугі», — паскардзіўся галава сям'і. А ён не можа знайсці падпрацоўку па сваіх сілах: пасля аварыі стаў інвалідам II групы. Сямён Шапіра прапанаваў садзейнічанне ў дадатковым працаўладкаванні, напрыклад, юрыстам у сельгаспрадпрыемстве. Але канкрэтнай згоды заяўнік не даў.

На прадэманстраваных падчас прыёму слайдах добра відаць, што сям'я пражывае ў дыхтоўным дарагім двухпавярховым катэджы, мае аўтамабіль, вялікі зямельны ўчастак. Тым больш насцярожвае пазіцыя заяўніка: яму ўсе абавязаны.

Як кажуць, для адных жэмчуг дробны, для іншых — суп рэдкі. Менавіта апошнія і не прывыклі патрабаваць у некага, задавальняюцца тым, што ёсць, а да сваіх праблем ставяцца з гумарам. У якасці прыклада кіраўнік цэнтральнага рэгіёна прывёў канкрэтную сітуацыю. Заехаў ён у невялікую вёсачку на мяжы Бярэзінскага і Крупскага раёнаў. Тут жывуць амаль адны старыя, нямоглыя, няма каму абкасіць быльнёг, у садзе ападаюць на зямлю і гніюць яблыкі. Нестае сіл і здароўя, каб іх сабраць ды здаць у раённую нарыхтоўчую кантору. У шахтавым калодзежы засталося вады толькі на два кольцы. 80-гадовы дзядуля трымае каня спецыяльна для таго, каб можна было куды з'ездзіць па сваіх патрэбах. Нядаўна тут разраўнавалі дарогу, а то, як пажартаваў стары, да гэтага ледзьве не растрэсла на калдобінах, аж лёгкія баляць.

Менавіта старшыня аблвыканкама «паказаў» дарогу ў гэты забыты Богам і людзьмі кут раённаму кіраўніцтву. Мясцовыя чыноўнікі прызналіся: сорамна, ні разу тут не былі. А праблемы тутэйшых насельнікаў паабяцалі па меры магчымасці вырашыць.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**
*lazovskaya@zviazda.by*

# «ГАРАЧЫЯ» ТЭЛЕФОНЫ

**У гэтую суботу, 19 верасня, у краіне пройдуць чарговыя прамыя лініі**

**Яны праводзяцца з 17 студзеня і створаны з мэтамі павышэння эфектыўнасці працы са зваротамі грамадзян і юрыдычных асоб, выкаранення фактаў бюракратызму і цяганіны, а таксама для аператыўнага вырашэння праблемных пытанняў, якія ўзнікаюць у людзей.**

**У гэтую суботу з 9.00 да 12.00 на прамыя тэлефонныя лініі выйдуць:**

**Брэсцкі аблвыканкам**
намеснік старшыні САКОЎСКІ Віктар Яўгенавіч (80162213121);

**Віцебскі аблвыканкам**
намеснік старшыні БЕЛАВУС Уладзімір Мікалаевіч (80212204260);

**Гомельскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ПІРШТУК Баляслаў Казіміравіч (80232751237);

**Гродзенскі аблвыканкам**
кіраўнік спраў ПАПОЎ Ігар Андрэевіч (80152735644);

**Мінскі аблвыканкам**
першы намеснік старшыні МАКАР Ігар Мікалаевіч (80175004160);

**Магілёўскі аблвыканкам**
намеснік старшыні ЯНКОЎ Дзмітрый Васільевіч (80222501869);

**Мінскі гарвыканкам**
намеснік старшыні БІРЫЧ Жанна Эдуардаўна (80172224444).

■ На слыху

# НЕ ПАДЗЯЛІЛІ ВОСТРАЎ З ЧАЙКАМІ

## У Магілёве занепакоены тым, што для свайго гнездавання птушкі выбралі папулярнае ў гараджан месца адпачынку

**Чайкі на Святым возеры ў Магілёве былі заўсёды, для свайго гнездавання яны выбралі зараснікі пасярод вадаёма. Месца лепш не прыдумаеш: зямля пад вадой, трыснёг, доступ чалавека абмежаваны. Сёлета колькасць птушак павялічылася настолькі, што папулярны сярод магілёўчан пляж даваўся закрыць, бо купацца ў вадаёме стала небяспечна для здароўя. І вось нядаўна ў Магілёўскім гарвыканкаме быў агучаны варыянт рашэння гэтага пытання. Каб пазбавіцца ад засілля чаек і праблем, звязаных з імі, востраў трэба ліквідаваць. «Гэта нам параілі спецыялісты інстытута водных рэсурсаў, — адзначыў мэр Магілёва Уладзімір ЦУМАРАЎ. — Інакш мы ніколі не зможам зрабіць так, каб людзі маглі купацца ў возеры. Неабходна выканаць рэкамендацыі, якія даў нам інстытут, і падрыхтаваць неабходныя дакументы».**

— Існуе некалькі варыянтаў, — працягвае наступствы **арнітолаг грамадскай арганізацыі «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Сямён ЛЕВЫ**. — Чайкі паспрабуюць прыстасавацца дзесьці ў прыбярэжнай частцы возера, перабрацца на другі, менш папулярны ў насельніцтва, вадаём або на тэрыторыю якога-небудзь буйнога прадпрыемства. Людзі ўжо неаднаразова сігналізавалі, што бачылі птушак на дахах прамысловых будынкаў «Магілёўхімвалакно». Няма гарантыі, што, калі востраў будзе знішчаны, яны не паспрабуюць знайсці сабе месца там. І гэта можа прывесці да яшчэ больш непрыемных наступстваў, чым на возеры. Ёсць прыклады, калі кіраўніцтва буйных прадпрыемстваў павінна было ісці на незапланаваныя выдаткі і ўсталёўваць тыя ж гукавыя гарматы, каб распуджваць няпрошаных гасцей. У дадзеным выпадку ўсе сродкі добрыя, акрамя аднаго — знішчэння птушак. Гэта ўжо парушэнне закона, якое прадугледжвае адміністрацыйную або крымінальную адказнасць.

Яшчэ адзін факт, на які звяртаюць увагу спецыялісты. Мы прывыклі скардзіцца на засілле ў горадзе гракоў, галак, а цяпер вось і чаек. Маўляў, лятаюць тут, цягаюць смецце, парушаюць гігіенічна-санітарную бяспеку. Можна, вядома, кінуць усе сілы на барацьбу з птушынымі і нават перамагчы. Але, як кажуць, варона з куста, а пяць на куст. На змену ім прыйдзе яшчэ больш непрыемны вораг — шэры пацук.

**Нэлі ЗІГУЛЯ.** *zigulya@zviazda.by*

■ Рабі, як мы!

# КВЕТКАВЫЯ ФАНТАЗІІ Ў ДЗЯТЛАВЕ

## «СТАЛІЦУ» АБЛАСНЫХ «ДАЖЫНАК» УПРЫГОЖЫЛІ АМАТАРЫ «ЗЯЛЁНАГА БУДАЎНІЦТВА»

**На Гродзеншчыне ўжо склалася традыцыя, што райцэнтры, дзе праходзяць абласныя «Дажынкі», упрыгожваюцца кветкавымі кампазіцыямі. Аб гэтым клапоцяцца работнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі, якія ладзяць конкурс прафесійнага майстэрства работнікаў «зялёнага будаўніцтва». Сёлета конкурс «Кветкавыя фарбы» адбыўся ў Дзятлаве, дзе неўзабаве будуць ушаноўваць аграрнікаў Прынямоння.**

— З кожным годам гэты конкурс набірае абароты, а яго ўдзельнікі не перастаюць здзіўляць сваім майстэрствам і фантазіяй, — кажа **начальнік аддзела водаправодна-каналізацыйнай гаспадаркі і добраўпарадкавання ўпраўлення ЖКГ Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір ЛЯВОНЕНКА.**

У конкурсе ўдзельнічаюць усе раённыя прадпрыемствы ЖКГ, прычым гэта не нейкая «абавязалаўка», а творчае спаборніцтва, дзе кожны стараецца здзівіць нейкай «фішкай» — не толькі журы, але, галоўнае, мясцовых жыхароў і гасцей горада.

Сёлета ў Дзятлаве канкурсанты спачатку прайшлі праверку тэарэтычных ведаў па «зялёным будаўніцтве» (пасадка, догляд раслін і г.д.), а затым раз'ехаліся па розных вуліцах райцэнтра, дзе ім для кветкавых «фантазій» прадаставілі ўчасткі плошчай ад 10 да 30 квадратных метраў.

— Прычым некаторыя месцы нават спецыяльна заказваюцца ўдзельнікамі конкурсу згодна з ідэяй іх кампазіцыі, — кажа **вядучы спецыяліст Гродзенскай абласной арганізацыі прафсаюза работнікаў мясцовай прамысловасці і камунальна-бытавых прадпрыемстваў Юлія КАХНОВІЧ.**

Ажыццявіць сваю ідэю кожная каманда павінна была не больш чым за тры гадзіны. Пры гэтым журы ацэньвала не толькі змест кампазіцыі, але і выкананне тэхналогіі пасадкі кветак, патрабаванняў да аховы працы і спецадзення. Пераможцаў узнагародзілі грашовымі прэміямі і памятнымі прызамі.

«Гродназеленбуд» (пераможца конкурсу ў першай групе — сярод буйных прадпрыемстваў) мовай кветак уславіў спорт і алімпійскі рух. Кампазіцыю Дзятлаўскага прадпрыемства ЖКГ («кветкавыя» гномы з сістэмай



кропельнага паліву раслін) адзначылі за арыгінальнасць ідэі, лідчан — за найлепшы асартымент расады. Ашмянцы ўпрыгожылі пляцоўку каля ЗАГСа кветкамі з галубамі *(на фота)*, воранаўцы зрабілі ў парку казачную клумбу з Бурацінам і Бабай Ягой. Мастаўчане (пераможцы ў другой групе) выкарысталі ў сваёй кампазіцыі еўрападдоны, на клумбе смаргонцаў «пасяліўся» мядзведзь, а слонімцы размясцілі на ёй раяль.

Дарэчы, удзельнікам конкурсу трэба было не толькі прыдумаць і выканаць кветкавую кампазіцыю, але і цікава яе прэзентаваць.

Конкурс у Дзятлаве закончыўся, аднак колькі яшчэ кветкавых фантазій наперадзе! Пэўна, ужо ёсць ідэі і на наступны год. А тое, што зроблена ў гарадах раней, падтрымліваюць у парадку мясцовыя камунальнікі. Многія кампазіцыі сталі ўжо тутэйшымі «фішкамі», дзе любяць адпачываць і фатаграфавацца сем'ямі.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.** *prakopchik@zviazda.by*

■ Вакол валюты

# КОНСУЛЬСКІЯ ЗБОРЫ СТАНУЦЬ РУБЛЁВЫМІ

**Для скарачэння выпадкаў выкарыстання замежнай валюты ў разліках на тэрыторыі нашай краіны Нацыянальным банкам унесены змяненні і дапаўненні ў Правілы правядзення валютных аперацый. Адпаведнае рашэнне прынята пастановай Праўлення Нацбанка Беларусі №515, якая ўступіла ў сілу з 16 верасня.**

У прыватнасці, гэтай пастановай выключаецца выкарыстанне замежнай валюты пры прыёме юрыдычнымі асобамі ад фізічных асоб замежнай валюты для аплаты дыпламатычным і іншым афіцыйным прадстаўніцтвам замежных дзяржаў консульскіх і іншых збораў па афармленні дакументаў фізічных асоб. Пры гэтым захоўваецца магчымасць прыёму замежнай валюты ад фізічных асоб непасрэдна дыпламатычнымі і іншымі афіцыйнымі прадстаўніцтвамі замежных дзяржаў.

Разам з тым, у прэс-службе рэгулятара ўдакладнілі, што для завяршэння выканання абавязацельстваў па дагаворах, якія былі заключаны ў замежнай валюце і выкананне абавязацельстваў па якіх было пачата сёлета да 16 верасня, разлікі ў замежнай валюце дапускаюцца да 31 снежня гэтага года ў парадку, які дзейнічаў на дату заключэння дагавораў. Аднак пры гэтым не дапускаецца заключэнне дадатковых пагадненняў да названых дакументаў, якія павялічваюць суму абавязацельстваў у замежнай валюце і тэрміны дзеяння гэтых дагавораў. Акрамя таго, суб'ектам валютных аперацый цяпер неабходна прывесці раней заключаныя дагаворы ў адпаведнасць з патрабаваннямі валютнага заканадаўства.

**Сяргей КУРКАЧ.** *kurkach@zviazda.by*

■ Абітурыент-2016!

# АЛЬТЭРНАТЫВА РЭПЕТЫТАРСТВУ

**Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт запрашае старшакласнікаў на бясплатныя дыстанцыйныя курсы па паглыбленым вывучэнні матэматыкі і гісторыі. Стаць іх слухачом можа школьнік з любога, нават аддаленага населенага пункта краіны.**

Дыстанцыйная школа юнага матэматыка (www.dl.bsu.by) стартуе 21 верасня, а 5 кастрычніка эстафету падхопіць дыстанцыйная школа юнага гісторыка (www.hist.bsu.by/school). Для матэматыкаў кожны занятак разлічаны на тыдзень: ён уключае прапрацоўку тэарэтычнага матэрыялу і прыкладаў з рашэннямі. Юным гісторыкам, акрамя лекцый, будуць прапанаваццы тэставыя і творчыя заданні.

Кансультацыі, абмен меркаваннямі, зносіны паміж настаўнікамі і школьнікамі пройдуць у рамках форумаў, чатаў і з дапамогай электроннай перапіскі.

Курсы распрацаваны з улікамаднагадовай праграмы і арыентаваны ў першую чаргу на адзінаццацікласнікаў. Але далучыцца да дыстанцыйнага навучання могуць і дзесяцікласнікі.

**Надзея НІКАЛАЕВА.** *nikalaeva@zviazda.by*

■ Юбілеі

# КупалаўскіStar

## Гарэзлівы, жвавы, кемлівы — у свае 95

**Калі шчыра, ну не дасі столькі. Ніяк. Асаблівa цяпер — падцягнуты, з фасада наогул свяціцца, загрымiраваўся пад маладзенькага. А вось унутры не загрымiруеш: душу, талент, імпэт — што ёсць, тое ёсць і нікуды не падзенеш. У тэатраў жа, як у людзей: як бы і з чаго яны ні пачыналіся, важна тое, што ўяўляе з сябе іх справа, які ў ёй сэнс.**



І вось тут пачынаецца дзіва. Можна аднойчы купіць квіток у распаўсюджвальніка, чыста па размове разумеючы, што для цябе ў гэтай краіне ёсць тэатры, можа, больш зразумелыя, але, калі ўсё ж прыйшоў у Купалаўскі, многія пытанні адразу здымаюцца, яны застаюцца за дзвярыма. Купалаўскі зразумелы заўсёды і ўсім, няма пытанняў, чаму ён такі, пра што гаворыць. І няма іншага выйсця, чым самому ў сваім сэрцы шукаць з ім паразумення. Наталля Качанава, віцэ-прэм'ер урада Беларусі, напрыклад, падкрэсліла: «Купалаўскі тэатр, несумненна, найвялікшы здабытак нашай нацыянальнай культуры. Сёння ўсе словы віншавання — у адрас калектыву». Яна іх сказала за сябе і... не толькі за сябе, зачытаўшы віншаванне Прэзідэнта. А гэта фактычна — за ўсю краіну. І шукала з ім паразумення для сябе як звычайны глядач, які проста прыйшоў у тэатр прыемна правесці час, таму што ў юбілейны вечар тут усё было па-свойску: тэмы, словы, спевы. Феерыя талентаў. Славуты «купалаўскі» капуснік, дзе тэатр — больш, чым тэатр. Ён фактычна асобны свет, дзе няма нічога немагчымага.

Вось уявіце толькі сабе Марлен Дзітрых у ролі «Паўлінкі» — як бы загучалі словы Купалы з лёгкім акцэнтам? Ці падумайце толькі: якім потам здабываюцца на тэатральным фронце «крапавыя жабо» за добрасумленную службу. А масоўка — гарачая кропка тэатра, дзе прапаў без вестак не адзін чалавек. Яна ледзь не ўзяла верх гэтым вечарам над «рэжысёрскім дыктатам». Тут працуюць мужныя хлопцы, якія ўмеюць рабіць «пліе» і маюць свой прафесійны выбар: «трагік» ці «комік». Тут не важны агульны танаж трупы і нацыянальнае пакуль не саступае рацыянальнаму. Таму што і без суровых горцаў ведаюць, як смачна прыгатаваць гарачых артыстаў: яны самі па сабе ўсе тут гарачыя, «купалаўцы» яшчэ і іншых запаліць умеюць. Мужнасць і адданасць гэтых людзей справе доказана за дзесяцігоддзі: пакаленні на сцэне мяняліся, а дух «купалаўскі» прымаўся нашчадкамі.

Узгадалі былое. Без залішніх сантыментаў. Але была магчымасць (увасабе сабе!) пабачыць на сцэне Стэфанію Станюту, Галіну Макараву, Лідзію Давідовіч, Паўла Кармуніна і іншых. Ім (на экране) дапамагалі партнёры па сцэне — народныя артысты Беларусі Генадзь Аўсяннікаў і Генадзь Гарбук. Сыгралі ў дуэце Галіна Талкачова і Аўгуст Міланаваў. Усіх, хто служыў у тэатры, узгадалі — старыя фотакарткі стужкай (нібыта кіно) прайшлі перад вачыма.

Тут не бывае былых. І ніхто не чужы, нават той, хто прыходзіць у гэты тэатр упершыню, і той, хто думае, што яго не разумее. Проста вам пакажуць, што гэта насамрэч не так. Перад урачыстым вечарам раздавалі навушнікі для сінхроннага перакладу. Тэхніка ў дапамогу: сёння французская п'еса ігрaецца. П'еса і сапраўды французская — «Сфінкс». Ігралі невыпадкова: гэта быў першы спектакль, пастаўлены ў Мінску ў будынку гарадскога тэатра, які з'явіўся за гады кіраўніцтва гарадскога галавы Караля Чапскага. П'есу, якая мае адносіны да гісторыі айчыннага тэатра, знайшлі ў архівах Санкт-Пецярбурга. І вось у тым жа тэатры (будынку) зноў «Сфінкс». Не толькі назва таямнічая. Таямнічасць была ў навушніках. Адкуль у твой розум стала загружацца размова герояў па-беларуску. І мінула колькі хвілін, перш чым прыйшло разуменне: іграюць па-руску. Але ж гэта — Купалаўскі. Ён такі. З чымі і можна павіншаваць усю нашу краіну. І маліцца за яе разам з ім, вымаўляючы пад музыку Уладзіміра Кур'яна словы Янкі Купалы.

**Ларыса ЦІМОШЫК.** *tsimoshyk@zviazda.by*

## БЕЛОРУССКАЯ ПАТРИОТИЧЕСКАЯ ПАРТИЯ
## РЕСПУБЛИКАНСКОЕ ОБЩЕСТВЕННОЕ ОБЪЕДИНЕНИЕ «БЕЛОРУССКОЕ КАЗАЧЕСТВО»

# ЗА МИР, СПОКОЙСТВИЕ И ПОРЯДОК

## ПРОГРАММА КАНДИДАТА В ПРЕЗИДЕНТЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ, ПРЕДСЕДАТЕЛЯ БЕЛОРУССКОЙ ПАТРИОТИЧЕСКОЙ ПАРТИИ, ВЕРХОВНОГО АТАМАНА РЕСПУБЛИКАНСКОГО ОБЩЕСТВЕННОГО ОБЪЕДИНЕНИЯ «БЕЛОРУССКОЕ КАЗАЧЕСТВО»

## УЛАХОВИЧА Николая Дмитриевича

Родился 21 августа 1951 года в г. Минске, белорус. Отец — участник Великой Отечественной войны, работал в стройтресте №15 «Спецстрой» г. Минска. Мать — пенсионерка, проживает в г. Минске. Трудовую деятельность начал в 1969 г. после окончания Минского архитектурно-строительного техникума. В 1974 г. окончил Симферопольское высшее военно-политическое строительное училище, в 1984 г. — Ивановский государственный университет, в 1992 г. — Волгоградский инженерно-строительный институт.

Проходил службу в Вооруженных Силах, участвовал в строительстве космодрома «Байконур», удостоен звания почетного строителя Байконура. Полковник в отставке. После выхода в отставку работал на руководящих должностях в республиканских органах государственного управления.

В настоящее время работает заместителем председателя правления по строительству Минского областного потребительского союза. Награжден медалями и грамотой Национального собрания Республики Беларусь, орденом Кирилла Туровского Белорусской Православной Церкви.

Много времени уделяет развитию патриотических традиций белорусского народа. По его инициативе в 1995 г. было создано Республиканское общественное объединение «Белорусское казачество». С 1999 г. возглавляет Белорусскую патриотическую партию, главной целью которой является мир, спокойствие и порядок в Республике Беларусь. Женат, имеет двоих детей: дочь и сын, 5 внуков.

**ЧТО НАДО СДЕЛАТЬ:**

В условиях глобализации одним из важнейших направлений является сохранение самобытности и традиций белорусского народа, а также равноправное и взаимовыгодное сотрудничество Беларуси с зарубежными партнерами, укрепление и развитие сотрудничества в рамках СНГ, Евразийского экономического союза и других международных организаций, углубление и развитие взаимовыгодных и равноправных союзнических отношений с Российской Федерацией.

***В духовно-патриотическом воспитании***

Развитие национальной идентичности белорусской нации на основе многовекового исторического наследия, традиций и культуры, через возрождение родного языка.

Формирование системы духовного и патриотического воспитания, основной целью которой станет всестороннее развитие личности, привитие таких качеств как патриотизм и преданность своему народу, толерантность и нетерпимость к проявлению насилия в любой форме — всего того, что всегда было присуще белорусскому народу.

Взаимопонимание должно стать основой для постоянного диалога между различными общественно-политическими силами общества, что не допустит силового противостояния.

Продолжение развития патриотических традиций белорусского народа любви к Родине, ее истории, отчему дому, семейным ценностям. Одна из важнейших задач — сохранение традиций, преемственность опыта, накопленного предыдущими поколениями, духовных и материальных ценностей белорусского народа.

Будущее принадлежит молодежи: юношам и девушкам, обогатившим себя познанием национального историко-культурного наследия и стремлением к высшим духовным и нравственным ценностям.

Поддержка действующих на территории Республики Беларусь традиционных конфессий и сотрудничество с ними.

Всемерное противодействие попыткам переписать историю. Сохранение исторической правды о героизме народа в годы Великой Отечественной войны, о великой победе над фашизмом и истории современной Беларуси.

***В укреплении государственности***

Мудрость и опыт белорусского народа позволяют избежать слепого следования принципам иллюзорной зарубежной демократии, без отрицания общечеловеческих ценностей и значимости наиболее передовых форм взаимодействия гражданского общества и власти. Раскрепощение личности — путь к формированию дееспособного государственного аппарата, способного плодотворно работать на благо народа. Творчество, профессионализм, честность и порядочность — вот те качества, без которых никто не может быть допущен к государственной службе.

Гарантии безопасности личности и общества, постоянная забота государства о благосостоянии народа — основа процветания нации.

Дальнейшая консолидация белорусского общества через расширение участия представителей гражданского общества в управлении государством.

Совершенствование избирательного законодательства путем перехода на смешанную систему выборов по партийным спискам.

Совершенствование системы государственного управления через устранение чрезмерной централизации и предоставление большей самостоятельности субъектам хозяйственной деятельности. Имплементация принципов независимости всех ветвей власти.

Борьба с коррупцией и дальнейшее совершенствование механизмов участия институтов гражданского общества в антикоррупционной деятельности.

***В экологической сфере***

Бережное отношение к природе. Восстановление природных ресурсов через внедрение прогрессивных методов хозяйствования на земле и «зеленых» технологий.

***В экономике***

Развитие и укрепление традиционных для Беларуси отраслей экономики, отказ от производства «всего у себя» и обеспечение потребностей государства через расширение межгосударственной экономической интеграции.

Повышение конкурентоспособности выпускаемой продукции, создание условий, действительно обеспечивающих приток инвестиций и передовых технологий.

Поэтапное сокращение внешнего государственного долга и проведение взвешенной монетарной политики. Исключение решения сиюминутных проблем за счет будущих поколений.

Проведение реформы налоговой системы через ее упрощение и сокращение количества налогов. Обеспечение прозрачности в ценообразовании товаров и услуг.

Всесторонняя поддержка и развитие частной инициативы и предпринимательства, в основном малого.

***В трудовой сфере***

Гарантия полной трудовой занятости для трудоспособного населения. Использование высокой профессиональной подготовки и многолетнего опыта работающих пенсионеров, сохранение преемственности трудовых династий. Критерием для увольнения работника должен быть не возраст, а качество выполненной работы. Изменение существующей контрактной системы.

Внедрение передовых мировых безотходных и малоотходных технологий в производство, сельское хозяйство, строительство, жилищно-коммунальное хозяйство и другие отрасли. Продолжение субсидирования государством услуг ЖКХ.

Обеспечение дальнейшей информатизации производственных процессов. Ускорение развития логистических центров с целью наиболее эффективного использования транзитного положения Беларуси.

***В социальной сфере***

Обеспечение достойной заработной платы врачам, медицинскому персоналу, учителям, сотрудникам детских дошкольных учреждений, работникам культуры. Сохранение государственной поддержки для наименее обеспеченных слоев населения.

Увеличение государственных вложений в развитие здравоохранения, образования, культуры и науки. Обеспечение равной доступности населения к высокотехнологичной медицине и образованию.

Гарантии обеспечения достойных условий жизни для престарелых. Уважение и помощь ветеранам — основа духовности белорусского общества.

Принятие действенных мер по формированию доступной среды для лиц с ограниченными возможностями и особенностями развития.

Дальнейшее развитие науки, укрепление ее связи с производством. Создание условий для наиболее полной реализации творческого потенциала белорусских ученых, обеспечение достойной оплаты их творческого труда.

Всемерное содействие развитию в обществе здорового образа жизни, спорта, повышению эффективности борьбы с алкоголизмом, курением, наркоманией в первую очередь среди молодежи.

Патриотизм, любовь к Родине, уважение к истории, сохранение и приумножение традиций, семейных ценностей и готовность защищать их обеспечат мир, спокойствие и порядок в Республике Беларусь.

Историю Беларуси пишем мы с вами.

**ПОДДЕРЖИМ КАНДИДАТА В ПРЕЗИДЕНТЫ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ УЛАХОВИЧА НИКОЛАЯ ДМИТРИЕВИЧА**

З нагоды

# ПА ВУЛІЦЫ 17 ВЕРАСНЯ БЕЗ АРКЕСТРА

## Але з веданнем, памяццю і адказнасцю

Сённяшні дзень — 17 верасня, дзень уз'яднання беларускіх земляў — на маёй радзіме пройдзе як звычайны, адзін з многіх. Праедуць паміж вёскамі паштовая ды хлебная машыны, прытарможваючы на Кантрольнай, бабулі, можа, праз тую ж Кантрольную збяруцца ў Волму ў касцёл, заўзяты грыбнік дзядзька Іван зазірне ў Заставу: ці не высыпалі пасля дажджу апенькі... Пра падзеі 20-х — 30-х гадоў мінулага стагоддзя, калі тут была мяжа паміж Усходняй і Заходняй Беларуссю, тут помняць толькі красамоўныя назвы пасаджаных уздоўж падзелу кустоў ды лесу, у якім размяшчаліся пагранічнікі. Людзі, штодня перасякаючы тую былую мяжу, проста не задумваюцца, не згадваюць, што калісьці, насамрэч не так даўно, было інакш. Ідуць ці едуць з адной беларускай вёскі ў другую беларускую вёску, дзе паўсюль усе адно аднаго ведаюць, дзе амаль усе адно аднаму сваякі, дзе знаёмыя «родавыя» прозвішчы, дзе нават магілкі агульныя. Так было доўгія стагоддзі, спрадвеку: адна гісторыя, адна радзіма, адны клопаты, адна мова, адны песні. Так ёсць сёння, і тыя васямнаццаць гадоў, калі людзей падзяліла штучная мяжа, не прайшлі бясследна — гэта таксама агульная гісторыя, агульныя ўспаміны, агульныя трагедыі загубленых жыццяў, разлучаных сем'яў, няспраўджаных мар.

Што быў той Брэсцкі мір, заключаны ў 1921-м, для Беларусі, калі палітыкі, рэалізуючы свае планы і амбіцыі, проста правялі лінію алоўкам на карце, разадраўшы адзін народ на дзве часткі? Янка Купала, які вельмі перажываў за лёс сваёй Бацькаўшчыны, пра гэта з болем напісаў:

*Бах, нашу Айчыну*
*Без нашае волі,*
*Як тую аўчыну*
*Ў шматкі папаролі.*

Што быў Брэсцкі мір для маёй асобна ўзятай, тыповай беларускай сям'і? Ні я, ні мае старэйшыя не ведаем, дзе магіла прабабулі. Бабуля васямнаццаць гадоў магла толькі з-за гумнаў глядзець на могілкі на «польскім» баку, дзе была пахавана яе маці. У 39-м, калі мяжы не стала, яна магілы не знайшла: крыж згніў, месца зраўнялася...

І гэта толькі адзін асобна ўзяты эпізод. Для ўсяго народа — і па адзін, і па другі бок мяжы васямнаццацігадовая гісторыя падзелу складалася з асобна ўзятых трагедый, якія не бываюць большымі ці меншымі. Мяжа і для ўсходняй паловы стала драматычным водападзелам (толькі ў маёй вёсцы ў 30-х гадах «знайшлося» 35 «польскіх шпіёнаў»). А колькі было павысяляна хутароў і маленькіх вёсачак уздоўж мяжы: ад іх засталіся толькі назвы ўрочышчаў, а ўнукі і праўнукі вымушаных перасяленцаў і сёння прыязджаюць у чыстае поле шукаць падмуркі радзімы.

На заходнім баку было не лепш. Родная мова магла гучаць толькі ў сваёй хаце — ні ў школах, ні ў іншых установах яе не хацелі разумець і прызнаваць. Спробы сказаць уголас «Я — беларус і правы маю!» заканчваліся турэмным зняволеннем або ўвогуле канцлагерам (мы і сёння дакладна не ведаем, колькі беларусаў, а з імі і ўкраінцаў, і рускіх, і палякаў прайшло праз «выхаваўчы прафілакторый» пад Бярозай Картузскай, колькі згінула там бясследна). Песні на нашай мове не гучалі на ўвесь голас, а даносіліся з-за кратаў, і гэта таксама наша агульная гісторыя, наш боль (можа, таму ў таго, хто чытае верш Максіма Танка «Спатканне», і сёння «вочы мокрыя ад слёз»).

17 верасня — дзень уз'яднання — свята, але свята ціхае. Можа, таму, што ў гэты дзень проста ўсё стала на свае месцы — як было і як павінна было быць заўсёды? Можа, таму, што ў нашай найноўшай гісторыі ўжо пасля была адна вялікая бяда, у якой гаравалі разам, якую разам, адным непадзельным народам, перажылі, і адна Вялікая Перамога, дзеля якой беларусы, адзін непадзельны народ, аддалі кожнага трэцяга. І менавіта гэты адзіны народ, які паклаў на барацьбу з фашызмам столькі жыццяў, ганаравалі ў свеце: БССР стала адным з заснавальнікаў Арганізацыі Аб'яднаных Нацый...

Кожны раз, прыязджаючы дадому на аўтобусе, я перасякаю тую колішнюю мяжу. Нярэдка думалася: навошта тыя кусты пад назвай Кантрольная, даўно б іх выкарчавалі, пару лішніх гектараў бы засеялі. Цяпер, гледзячы на тое, што адбываецца ў свеце, калі з лёгкасцю раздзяляюць людзей па рэлігійным, моўным, ідэйным прынцыпе, калі брат забівае брата, думаю інакш. Няхай і кусты, і назва застаюцца. Як і вуліцы 17 верасня ў нашых гарадах і мястэчках. Як напамін аб тым, што гэта было. Як сімвал таго, што мы ніколі больш падобнага не дапусцім.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.** *alena@zviazda.by*

Сямейная газета

Выпуск № 15 (38)



## «Я Ж ТВАЯ МАМА...»

У майго сябра з дзяцінства псіхалагічная траўма. Бацька ніколі ў яго не верыў. «Калі я, яшчэ школьнікам, прынёс тату свой першы верш, ён толькі пасмяяўся: працягнуў кнігу Ясеніна і сказаў «не займайся дуратой, лепш чытай сапраўдных паэтаў». Тая ж самая рэакцыя была і пасля таго, як ён даведаўся, што я сабраўся ехаць у Маскву па сваю першую гітару. Калі б тады паслухаў бацьку, то ў мяне, як і ў яго, павер, не было б ні свайго гурта, ні музычнага альбома, ды і вершы я наўрад ці працягваў бы пісаць...»

Я магу зразумець сябра, але з цяжкасцю. Бо мне ў гэтым плане пашанцавала: мама і тата заўсёды ў мяне верылі. Але ж ідэальных бацькоў (як і дзяцей, дарэчы) не бывае. Мая мама, напрыклад, штораз, калі я збіраюся ў чарговую паездку за мяжу, кажа: «Мо не едзь... А раптам самалёт упадзе, цягнік разаб'ецца?.. Я ж твая мама і хачу табе толькі дабра». (Ды я ні кропелькі і не сумняваюся, што мой самы блізкі чалавек жадае мне дабра. Але ж часам тое, што для аднаго добра, для іншага — смерць.) Звычайна ў такіх выпадках пачынаю казаць ёй пра свае адчуванні, мары і жаданні... Прыводжу цытаты славутых людзей. Маўляў, святы Аўгусцін казаў, што «Свет — гэта кніга, і той, хто не падарожнічае, чытае толькі адну старонку». Мама быццам бы пагаджаецца, што ў нас розныя погляды на некаторыя рэчы (і ў гэтым няма нічога благога) і, насуперак сваім беспадстаўным страхам, блаславіе мяне багацець душой. Але ж я прылятаю ў іншую краіну і знаходжу ў чамадане буклет «Што рабіць, калі вы трапілі ў рабства»... Атрымліваецца яна, чамусьці замест таго, каб шукаць пазітыў, працягвае бачыць негатыў...

Не так даўно размаўляла на гэтую тэму з маці двух дарослых хлопцаў. Адзін з іх жыве ў Індыі, дзе ажаніўся з японкай. Год таму Вераніка стала бабуляй. Праўда, бачыць сваю ўнучку не так часта, як хацелася б. Многія мамы-бабулі ў падобнай сітуацыі, хутчэй за ўсё, не спалі б ночы на пралёт з-за сваіх надуманых страхаў... Вераніка ж сказала мудрую рэч: «Чамусьці бацькі, замест таго, каб думаць пазітыўна, акумулююць вакол сябе негатыў. Не разумеюць пры гэтым, што думкі здольныя матэрыялізавацца. І той страх, якія яны выпускаюць на волю, перадаецца і іх дзецям. А лепш бы перадавалі спакой, упэўненасць і падтрымку».

Напрыканцы свайго года (а я яго лічу ад аднаго дня народзінаў да другога) па традыцыі адкрываю ўласны дзённік і падводжу вынікі. Самы лепшы дзень у 2015-м — гэта, несумненна, вяселле. А ўсё таму, што прайшло яно не так, як спрабавалі навязаць нашыя бацькі, а так, як мы адчувалі. Вы і не ўяўляеце, колькі сіл і нерваў было змарнавана, каб даказаць ім, што вяселле без вэлюма і тамады — таксама вяселле. Але найбольш складана было пераканаць іх прыйсці на роспіс без зрэзаных кветак. Сябры, у адрозненне ад бацькоў, здзівіліся, пачуўшы нашу просьбу, але сказалі: «Ваша жаданне для нас закон». Бацькі ж да апошняга парываліся той закон парушыць. Маўляў, што людзі скажуць?.. Парадокс атрымліваецца: чамусьці іх на той момант больш хвалявала, што скажуць незнаёмыя людзі, чым тое, што адчуваюць родныя дзеці... Дарэчы, у выніку ўсіх гэта стымулявала праявіць фантазію: хтосьці падарыў кветкі ў гаршку, хтосьці — насенне з пажаданнем-падтэкстам «Дзіцячы лужок»... Сваё рашэнне мы патлумачылі адразу ж пасля роспісу — прывезлі гасцей у батанічны сад і ўключылі песню Юрыя Антонава: «Не рвите цветы, не рвите, /Пусть будет нарядной Земля, /А вместо букетов дарите/ Васильковые, незабудковые /И ромашковые поля». Мы проста хацелі, каб наша вяселле было сімвалам новага жыцця, а не зрэзаных кветак. І пагадзіцеся — мелі на гэта поўнае права. А слухаць парады людзей (няхай гэта і самыя блізкія), якія жывуць не так, як хачэў бы жыць ты, вядома, можна. Але ці заўжды прыслухоўвацца, вырашайце самі...

**Надзея ДРЫЛА.**
*dryla@zviazda.by*

■ Шлях да любові



Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

# «ЛЮБІМЫ» І «ГОРЫЧ» БАЦЬКОЎ ГРЫГАР'ЯНАЎ

## Як змагацца са стэрэатыпамі ў сабе, блізкіх і грамадстве

**Аляксандр і Таццяна Грыгар'яны ўсынавілі ці, як яны кажуць, адаптавалі двух дзяцей — хлопчыка і дзяўчынку. Іх гісторыя — не адзіны ў краіне прыклад. Але яны расказваюць яе без таго флёру шкадавання, дабрадзейнасці і слязлівасці, якімі звычайна прасякнуты такія аповеды. Расказваюць шчыра, як яно насамрэч ёсць. А ёсць цяжкасці, маральная і фізічная праца, якую часам немагчыма цягнуць. Але, галоўнае, ёсць воля і розум, якія нараджаюць дзеянне, а дзеянне нараджае любоў. Бо «любіць», як падкрэсліваюць Аляксандр і Таццяна, гэта дзеяслоў. Толькі калі працуеш над пачуццямі, яны прыходзяць. Сапраўдныя. Шчырыя. Трывалыя. І гэта — шчасце.**

### «МНОГІЯ ПРАДАЮЦЬ МАЁМАСЦЬ, РОБЯЦЬ ЭКА — І БЕЗВЫНІКОВА»

— Калі мы пазнаёміліся, ведалі аб верагоднасці таго, што сваіх дзяцей у нас можа не быць. Але нас гэта не спужала, — гаворыць Аляксандр Грыгар'ян.

— Спачатку, як усе, пайшлі да доктара, — уключаецца ў размову Таццяна. — Але гэта патрабуе столькі грошай і часу, што ўвесь мой гадавы заробак ва ўніверсітэце (Таццяна выкладае замежныя мовы. — **Аўт.**) ішоў на лекі і аналізы. Тыя прэпараты, якія я прымала, зрабілі толькі горш і прывялі да дадатковых хвароб.

Наступным этапам сталі думкі аб ЭКА. Аднак гэтая працэдура таксама вымагае немалых грошай, часу і не найлепшым чынам уплывае на здароўе.

— Ніхто аб гэтым не гаворыць, а атрымліваецца, як у казіно: мне патрэбна маё дзіця, біялагічнае, — заўважае Таццяна. — Мы знаёміліся з людзьмі, многія з іх прадаюць кватэры, дачы, машыны, іншую маёмасць, бяруць крэдыты, робяць па 5, 6, 7 спроб — і безвынікова.

У Грыгар'янаў не было такіх сродкаў, ды і рызыкаваць здароўем больш не хацелі. Да таго ж касцёл — Аляксандр і Таццяна каталікі — не ўхваляе гэтую працэдуру. Таму сышліся на ўсынаўленні.

— У грамадстве няма станоўчага погляду на гэтую тэму, — мяркуе Аляксандр. — Многія лічаць, што прыёмныя бацькі зарабляюць на дзецях грошы. Але нам першы раз нават соромна было запытацца пра нейкія выплаты, якія нам належалі.

*(Заканчэнне на 2-й стар. «СГ».)*

■ Сямейная справа

# З ІГОЛКІ ХЛЕБ КОЛКІ?

## Маці і сын з Маларыты ствараюць прыгажосць сваімі рукамі

**Алена Талашка — намеснік дырэктара прафесійна-тэхнічнай навучальнай установы. На працы яна заўсёды дзелавая і элегантная дама... І раптам лялькі! Так, яна ўжо даўно захапляецца лялькамі. Ёй удаюцца самыя розныя вобразы: ад гламурных прыгажунь да бойкіх паненак у рэперскім убранні.**

### «ДЗЕД МУСІЎ ЗА АДНУ НОЧ ПАШЫЦЬ КАСЦЮМ НАЧАЛЬНІКУ ЛАГЕРА»

— Лялькі — гэта хобі, частка жыцця, — Алена Аляксандраўна задумваецца. — Гэта тое, што ратуе ад сумных думак, дэпрэсіўнага настрою, дае ўнутранае натхненне.

А пачалося ўсё, можна сказаць, выпадкова. Калі з мужам разбіралі



Антон і Алена Аляксандраўна Талашкі: «Лялькі і кашулі — наша сямейнае хобі».

рэчы ў асірацелым доме яго бацькоў, знайшлі кавалачак ільняной тканіны. Гэтае палатно было вытакана рукамі свекрыві. Алена не магла яго проста закінуць куды далей і забыцца. Ёй захацелася раптам знайсці прымяненне гэтаму абрэзку, зрабіць з яго нешта прыгожае. Вось так паступова ў яе галаве пачала выспяваць думка пра будучую ляльку, якую можна апрануць, скажам, у льняную сукенку.

Насамрэч яе захапленне пачыналася раней за знаходку ў пустым доме, нашмат раней. Калі прабабка працавала белашвачкай і вышывала па шоўку для багатых жанчын, калі дзед за адну ноч мусіў пашыць касцюм начальніку лагера... Алена вырасла ў сям'і патомных швейнікаў. Маці яе бабулі была майстрыхай вышыўкі ў расійскай глыбінцы. Прадзед, царскі інжынер, працаваў на кітайскай чыгунцы. Яго дачка не мінула рэпрэсій за сваё паходжанне. І атрымала яна, як і большасць палітычных вязняў таго часу, дзесяць гадоў. Дзяўчыну выратавала тое, што працаваць давялося не на лесапавале, а ў швейнай майстэрні. Узяў яе ў пашывачны цэх былы рабочы швейнай фабрыкі «Бальшавік». Ён нарадзіўся ў Беларусі, у Камянецкім раёне, потым падаўся ў Маскву, стаў кваліфікаваным краўцом. А ў 1938 годзе трапіў у жорны рэпрэсіўнай машыны.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Нататкі таткі



# ЗАЎСЁДЫ ПАДСТАВІЦЬ РУКІ

**Пасля нараджэння дачкі я стаў сентыментальным. Не скажу, што раней быў сухаром, але цяпер усё, што датычыцца дзіцячай тэматыкі, успрымаю ў некалькі разоў вастрэй. Бывае, назіраеш за Васілісай, як яна вырасла, як навучылася самастойна рабіць многія рэчы, і вочы ўжо блішчаць ад шчасця. Шчасця, якое ты баішся страціць больш, чым сваё жыццё.**

Апошнія паўтара года я амаль не гляджу тэлеканалы, якія злоўжываюць крымінальнай тэматыкай, у газетах і інтэрнэце адразу адфільтроўваю навіны, у якіх ідзе гаворка пра няшчасныя выпадкі з удзелам дзяцей. Пасля нараджэння дачкі я чамусьці падсвядома кожны раз праецырую сітуацыі на сябе. «Бацька не змог выратаваць на пажары сваю дачку», «Дзіця выпала з акна шматпавярховага дома», «Гульні на дарозе абярнуліся бядой» — на жаль, не прыходзіць і тыдня, каб загаловак прыблізна такога сэнсу не з'явіўся ў стужцы навінаў. Адных толькі такіх слоў, без усялякіх падрабязнасцяў, дастаткова, каб усхваляваць на цэлы дзень.

У народзе кажуць: каб ведаў, дзе яма, то пераступіў бы. Так, нават дарослае жыццё немагчыма пражыць і не набіць гузакоў. З дзецьмі яшчэ складаней. Яны пазнаюць свет амаль без боязі. Бацькам заўсёды неабходна быць напагатове, каб паспець падставіць рукі, калі яны падаюць. Шкада толькі, што мы не заўсёды паспяваем гэта зрабіць. Ды і не ўсё можна прадугадаць.

Быў пачатак сакавіка. Дачцэ толькі споўніўся годзік. У гэты дзень павінны былі прыехаць хросныя, каб павіншаваць красуню са святам. Таму прачнуліся раней, каб паспець падрыхтавацца да гасцей. Пакуль гатавалі гарбату, малая, як звычайна, пешшу вымярала кухню і вывучала змесціва паліц. У адно імгненне вока яна падскочыла да стала, зачапіла пальчыкам кубак і перакуліла на сябе кіпень. Усё адбылося так хутка, што я не паспеў нават зрабіць два крокі, каб адштурхнуць яе. Далей усё было, як у кінастужцы, пастаўленай на хуткі прагляд. Не ведама з якіх глыбінь у галаве момантам усплылі атрыманыя ва ўніверсітэце веды па медыцынскай дапамозе. Здаецца, за хвіліну паспелі злётаць у аптэку, апрацаваць апекі, выклікаць «хуткую». У сябе прыйшоў толькі, калі машына «хуткай» з жонкай і малой ад'ехала ад дома, а я ў шортах, майцы і хатніх тапках застаўся без ключоў ля пад'езда. Тады я ўсвядоміў, што ў такім жа выглядзе бегаў у аптэку. Зразумеў, чаму нават без просьбаў мяне прапусцілі без чаргі...

Дзякуй Богу, правільна аказаная дапамога дазволіла праз некалькі дзён дачцэ быць ужо дома, а яшчэ праз месяц-другі ад гэтага выпадку на целе не засталася і слядоў. Але толькі на целе. У душы мы, бацькі, ніколі не перастанем дакараць сябе за такую недальнабачнасць. За пакуты, якія давялося перанясці малой. Боль жа, перажыты ля дзвярэй рэанімацыі, адкуль даносіўся крык Васілісы, напэўна, назаўсёды запісаўся на маім сэрцы.

Пасля таго выпадку мы стараемся быць максімальна ўважлівымі. Не тое, каб празмерна апякаць малую. Не, проста навучыліся думаць на некалькі крокаў наперад. Мы не пазбаўляем дачку самастойнасці і амаль не абмяжоўваем яе пазнавальную дзейнасць, толькі намагаемся быць заўсёды побач. І тлумачым, шмат тлумачым. Напрыклад, калі асвойвалі крутую лесвіцу на горку на дзіцячай пляцоўцы, спачатку падымаліся разам з ёй і паказвалі, як гэта трэба рабіць. Потым некаторы час ціхенька падымаліся следам за ёй, каб магчымасць пры неабходнасці падстрахаваць. Сёння яна смела і ўпэўнена разам з вялікімі дзецьмі падымаецца на самую высокую горку і з залівістым смехам спускаецца ўніз, дзе яе ўжо чакаюць мама і тата. І нават тут, калі ты дакладна ведаеш, што яна робіць гэта ўжо не ўпершыню, штораз у галаве з хваляваннем адлічваеш кожную прыступку і з палёгкай уздыхаеш, калі малая аказваецца на руках.

Толькі цяпер, калі стаў бацькам, я разумею многія хваляванні сваёй маці. У тым, што нам, малым, здавалася бяскрыўднымі гульнямі, яна часта апраўдана бачыла небяспеку. У рэальнасці ж колькі разоў бяда праходзіла зусім побач? Калі катаўся на крыгах, і адна з іх раскалолася. Дзякуй Богу, гэта адбылося ўжо ля берага. Як зваліўся з дрэва вышынёй з дом і ад моцнага ўдару некалькі гадзін нават не мог гаварыць. Калі, не ўмеючы плаваць, для форсу перад кампаніяй паказваў, што не баюся глыбіні, і ледзьве не патануў... Такіх выпадкаў, напэўна, у кожнага набярэцца цэлая калекцыя. Калекцыя, ад якой сівеюць нашы бацькі.

Сёння маёй дачцэ паўтара года. Яе крокі даўно ўпэўненыя, яна ўжо не ідзе, а ляціць па жыцці. Няглядзячы на гэта, мы, бацькі, заўсёды гатовы падхапіць яе на рукі, калі раптам яна ўпадзе. Як і дагэтуль, свае рукі гатовы падставіць нам і нашы бацькі.

**Аляксандр АЛЕСІК**

■

# «ЛЮБІМЫ» І «ГОРЫЧ» БАЦЬКОЎ ГРЫГАР'ЯНАЎ

## «ПЕРШЫХ АБДЫМКАЎ АД СЫНА ЧАКАЛІ ПАЎТАРА ГОДА»

У жніўні ўжо мінула тры гады з таго дня, калі ў сям'і з'явіўся першынец Давід. У біялагічнай маці ён быў трэцім, і яна адразу адмовілася ад яго, як і ад двух папярэдніх дзяцей. Грыгар'яны ўзялі хлопчыка дзевяцімесячным, і ўжо ў той час ён быў вельмі развіты фізічна — даюць аб сабе знаць афрыканскія карані дзіцяці. Усынавіць мулата было свядомым жаданнем Тацяны. Яна ведала, што такія дзеці яшчэ і вельмі музыкальныя. Сапраўды, Давід пачаў спяваць раней, чым гаварыць. Бацькі мяркуюць, што ён знойдзе сябе ў спорце і ў музыцы.

**«Спачатку мы выкідваем дзяцей з грамадства, а потым здзіўляемся, чаму яны не могуць у ім жыць».**

Родная маці прыёмнай дачкі Грыгар'янаў, Марыям, думала, адмаўляцца ад яе ці не. Дзяўчынка пры нараджэнні важыла менш за два кілаграмы і першыя дні свайго жыцця правяла ў рэанімацыі і каранцінных палатах. З вялізным спісам хвароб — выжыла. Але засталася без бацькоўскага клопату. Да таго, як у шасцімесячным узросце трапіць у сям'ю Грыгар'янаў, змяніла пяць устаноў. Дактары, гледзячы на не па ўзросце маленькую Марыям, уздыхалі: хадзіць яна не зможа. Цяпер дзяўчынцы 1 год і 3 месяцы, і яна ўжо бегае, а першыя крокі пачала рабіць нават раней за «сямейных» дзяцей.

Брат і сястра абсалютна розныя па характарах. Давід добра спаў па начах і спачатку быў вельмі самастойным. Затое ўдзень хлопчык гіперактыўны. Марыям першыя тры месяцы ў сям'і амаль не спала і кепска ела. Цяпер гэтая шчырая і адкрытая дзяўчынка без страху ідзе да людзей, усміхаецца. Яе брат таксама ўсмешлівы, але яго давер трэба заслужыць. Аляксандр кажа, што першых абдымкаў ад сына яны дачакаліся толькі праз паўтара года.

— Спачатку мы сябе ўяўлялі такімі добрымі хрысціянамі з велізарнай душой, што возьмем дзіця і будзем яго любіць, а яно будзе любіць нас у адказ і ў нас настане ідылія, — успамінаюць бацькі. — Вядома ж, так не атрымалася. І дзякуй Богу, што ёсць курсы падрыхтоўкі да адаптавання. Там распавядаюць, што гэта за дзеці, што яны перажылі, а галоўнае, даюць зразумець: ідэальнай карцінкі не будзе. Гэта будзе цяжка, і не праз дрэнныя гены. А таму, што мы самі робім з гэтымі дзецьмі. Выкідваем іх з грамадства, а потым здзіўляемся, чаму яны не могуць у ім жыць.

Калі мы прыязджаем у дзіцячы дом, бяром цукеркі, цацкі, падарункі, клоўнаў, бенгальскія агеньчыкі і робім там свята. І як растуць гэтыя дзеці? Яны не бачаць, як гатуецца ежа. Не прыбіраюць, не ведаюць, што такое грошы, адкуль яны біруцца і як іх размяркоўваюць. Да 18 гадоў ім даюць усё найлепшае, а пасля гавораць: «Ну ўсё, жывіце». А як ім жыць? Яны ведаюць, што ўсе ім павінны, бо заўжды так было. А насамрэч у дарослым жыцці ім ніхто нічога не павінен.

## «ДУМКА ПРА ЎСЫНАЎЛЕННЕ НІКОМУ НЕ ПРЫХОДЗІЦЬ»

Пахадзіўшы на курсы, прачытаўшы стос літаратуры, паглядзеўшы шмат фільмаў на тэму ўсынаўлення, Аляксандр і Тацяна вывучылі яе ўздоўж і ўпоперак. Яны былі гатовы да любых не самых добрых паводзін дзяцей у новай сям'і, бо ведалі іх магчымыя прычыны.

— Адзінае, да чаго я не быў гатовы, гэта выбар, — прызнаецца Аляксандр.

— Мы чакалі, што недзе ў сэрцы ёкне, што гэта наша дзіця, а яно не ёкае! — дадае Тацяна. — Калі ты прывозіш малое дадому, ты яго яшчэ не любіш, яно чужое. Але курсы дапамагаюць зразумець, чаму так. І нам спатрэбілася паўтара года, каб прыняць і палюбіць Давіда цалкам, як свайго. Гэта адбывалася паступова, самымі цяжкімі былі першая паўгода.

— Цяпер я ўжо не падзяляю «мой — не мой». Мой! І гэта вялікая радасць, усе гэтыя пачуцці, калі дзеці пачынаюць размаўляць, штосьці рабіць...

— Яны раскрываюцца пакрысе, як кветкі, — падтрымлівае мужа Тацяна.

На пытанне, што дапамагло зрабіць выбар і па-сапраўднаму палюбіць, бацькі ў адзін голас адказваюць: «Розум і воля». Але асабліва цяжка прыняць прыёмных дзяцей было блізкім Тацяны і Аляксандра.

Яшчэ адна праблема — непадрыхтаванае грамадства. Пакуль у нас не вельмі прынята гаварыць пра дзяцей, якіх усынавілі. Нават калі людзі даведваюцца, што Давід прыёмны, яны ўсё адно стараюцца знайсці ў ім падабенства з татам Аляксандрам, маўляў, у абодвух цёмная скура, вочы, валасы, нягледзячы на абсалютна розныя тыпажы.



Хочацца верыць, што далейшы шлях Марыям будзе сонечным.



Тата ідзе класці дачушку спаць.

— Мы адпачывалі з Давідам у Егіпце, да нас падыходзілі немцы і спакойна казалі: «О, вы ўсынавілі дзіця, супер!» Для іх гэта нармальна. А нашы людзі пачынаюць шукаць нешта: можа, з часоў Алімпіяды ў родзе з'явіліся цемнаскурыя ці жонка здрадзіла. Усё што заўгодна, але думка пра ўсынаўленне нікому не прыходзіць.

**«У нас пакуль што не так проста захаваць непажаданую цяжарнасць, каб потым аддаць дзіця ў добрую сям'ю. Таму мы ўдзячны тым маці, якія не забіваюць сваіх дзяцей».**

Часам людзі саромеюцца ўсынаўлення, бо нязздольнасць мець сваіх дзяцей расцэньваецца грамадствам як «невыкананне плана», паводле якога чалавек мусіць скончыць школу, ВНУ, пабрацца шлюбам, нарадзіць дзяцей, пабудаваць кар'еру.

— На падрыхтоўчых курсах усім парам было калі не за 40, то за 35. Толькі ў гэтым узросце людзі дазваляюць сабе не саромецца бясплоднасці.

## «МЫ ЎДЗЯЧНЫ МАЦІ, ЯКІЯ НЕ ЗАБІВАЮЦЬ СВАІХ ДЗЯЦЕЙ»

Па словах сужэнцаў, з кожным днём яны любяць дзетак усё больш, але гэта —вялізная праца над сабой. Яны заўсёды ведалі, што любоў абавязкова прыйдзе, трэба проста пачакаць, знайсці падыход. І дазволіць сабе перажыць тыя, не заўсёды пазітыўныя, пачуцці, якія ёсць напачатку, бо гэта натуральна. Адзінае, пра што крыху шкадуюць Тацяна з Аляксандрам, — гэта тое, што не ўзялі дзяцей раней, калі яшчэ

**Часам людзі саромеюцца ўсынаўлення, бо нязздольнасць мець сваіх дзяцей расцэньваецца грамадствам як «невыкананне плана».**

не настолькі зрасліся з працай, і што так доўга марудзілі з усынаўленнем Давіда, пакуль хлопчык пакутаваў адзін у доме дзіцяці. Магчыма, яны не ідэальныя бацькі. Але ў сям'і Давіду і Марыям лепей, чым было б у дзіцячым доме. За час адаптавання ў хлопчыка вылечылі хранічны абструктыўны бранхіт, ад якога ён пакутаваў ужо ў 9 месяцаў, у яго зводнай сястрычкі знік рахіт, адраслі валасы, сталі расці зубы і ўдвая павялічылася вага.

Маці, якія адмаўляюцца ад дзяцей пасля нараджэння, Грыгар'яны не асуджаюць. У іх на гэта свой погляд.

— На свеце немагчыма толькі адно: вярнуць жыццё. Цяпер вельмі лёгка зрабіць аборт, і ў нашым грамадстве гэта норма. Але ў нас заканадаўча пакуль што не так проста захаваць непажаданую цяжарнасць, каб потым аддаць гэтае дзіця ў добрую сям'ю. Таму мы ўдзячны тым маці, якія не забіваюць сваіх дзяцей, а пакідаюць ім магчымасць трапіць у сям'ю.

***

Усяго пару месяцаў таму Грыгар'яны змянілі гарадскую кватэру на дом у прыгарадзе. Пераехалі дзеля дзяцей: ім вельмі патрэбна свежае паветра і добрая натуральная ежа. І гэта — не проста прыгожыя словы. У бацькоў няма пазёрства і паказнога клопату пра малых. Але дачушку інакш як Мар'яша, «прынцэса» і «прыгажуня» не называюць. І за сына, як прызнаўся Аляксандр, гатовы стаяць як за свайго. Зрэшты, хто для каго ў гэтай сям'і з'яўляецца абаронцамі і настаўнікамі, яшчэ трэба падумаць. Бо дзякуючы дзецям Аляксандр і Тацяна знайшлі ў сабе волю, мудрасць, памножылі любоў. І дзецям недарэмна далі біблейскія імёны. У перакладзе са старажытнаяўрэйскай Давід значыць «любімы», Марыям — «горыч». Усё гэта спазнала сям'я Грыгар'янаў. І цяпер, шляхам любові, яна ідзе да выратавання. Бо цар Ізраіля Давід — прабацька, а Марыям — Марыя — Маці Хрыста.

**Дзіяна СЕРАДЗЮК.**
*seradzyuk@zviazda.by*
**Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)

■ Лёсы людскія

# ЧАС ПАЖЫЦЬ ДЛЯ СЯБЕ

Нядаўна мая сяброўка паведаміла прыемную навіну: «Выходжу замуж за іншаземца!». Нявесце 56 гадоў, яна маладая пенсіянерка. Вопытнай прафесіяналцы наймальнік прапаноўваў прадоўжыць кантракт, але Людміла катэгарычна адмовілася: хопіць, пара пажыць для сябе.

Пенсія ў яе па сучасных мерках нядрэнная: на хлеб з маслам хапае. Акрамя таго, да выхаду на заслужаны адпачынак яна рыхтавалася: адкладвала грошы. У банку ў яе захоўваюцца валютны і рублёвы ўклады. Працэнтаў, што здымае кожны месяц, хапае, каб цікава і карысна бавіць вольны час. Жаніх таксама забяспечаны, мае невялікае прыватнае прадпрыемства, якое прыносіць стабільны прыбытак. Пазнаёміліся яны праз інтэрнэт, і не праходзіць дня, каб не размаўлялі па «Скайпе». Вітас ужо гасцяваў у патэнцыяльнай жонкі, цяпер яна збіраецца да яго. «Маладыя» сумесна плануюць сваю будучыню: дзе будуць жыць, ці заключаць шлюбны кантракт.

— У мяне было не жыццё, а суцэльны стрэс, — прызнаецца сяброўка.

Зрэшты, я добра ведаю пра яе лёс. Выйшла замуж у студэнцкія гады. Нарадзіўся сын, па размеркаванні яе і мужа накіравалі на працу ў раённы цэнтр. Маладых пасялілі ў аварыйным бараку, які планавалася з цягам часу знесці. Зімой тэмпература ў памяшканні не перавышала 12 градусаў цяпла, з усіх куткоў задзімаў снег, не дапамагалі і абагравальнікі. Дзіця часта хварэла. Маці разрывалася паміж работай і малым. Заробкаў дваіх маладых спецыялістаў катастрафічна не хапала. І сямейная лодка, як той казаў, пайшла на дно. Засталася мая сяброўка адна з дзіцем на руках. Сёстры, што жылі ва Украіне, паклікалі да сябе. Пераехала, вывучыла ўкраінскую мову, уладкавалася па спецыяльнасці ў гарадскую газету. Затым узначаліла прэс-службу металургічнага камбіната з вельмі добрай на той час зарплатай, атрымала двухпакаёвую кватэру, з часам купіла яшчэ адну. Здавалася б, жыццё наладжвалася. Але тут сын-падлетак пачаў адбівацца ад рук. Шмат сіл, слёз, здароўя давялося патраціць маці, каб выцягнуць яго з дрэннай кампаніі.

У 35 гадоў Людміла выйшла замуж другі раз. Прыгажун, разумнік, вельмі добры, спагадлівы, гасцінны... Схільнасць да гарэлкі Сяргею спачатку ўдавалася ўтойваць. А потым пайшло-паехала.... Дзесяць гадоў жыцця мінулі, як у нядобрым сне: лячыла свайго любага ў псіхолагаў, псіхатэрапеўтаў, нарколагаў, выклікала брыгады хуткай дапамогі. Акрыяе — клянецца, што больш не будзе піць. Ды яго абяцанняў хапала ненадоўга. Чарговы раз ён так і не выйшаў з запою, сэрца спынілася. На той час жонка была ў камандзіроўцы, ледзьве паспела на пахаванне.

— Цяжка застацца ў 50 гадоў адной: сын вырас, вывучыўся, завёў сваю сям'ю, жыве асобна. Шкадавала сябе, плакала, — распавяла жанчына. — А аднойчы сказала: хопіць, пенсіянерка, трэба пачынаць жыццё з пачатку. Пачала працаваць над сваёй знешнасцю: касметолаг, педыкюр, манікюр, прычоска, запісалася на фітнес, аэробіку. І цяпер мае знаёмыя сцвярджаюць, што я выглядаю лепш, чым была ў 20 гадоў. Ды і сама стала сябе паважаць. А яшчэ з'явіўся час падарожнічаць, зарэгістравалася ў сацыяльных сетках, дзе знайшлося шмат цікавых для мяне людзей і нават прэтэндэнтаў на руку і сэрца. Не перабольшваю, выбар шырокі, але спынілася на адным. Фліртаваць ды падаваць надзею іншым не хачу.

— У нашым грамадстве лічыцца, што выйсці замуж у 18 гадоў — вельмі рана, у 40 — запозна. Нават трыццацігадовую цяжарную жанчыну ў паліклініках называюць «старой», — працягвае Людміла. — Вось і лезем мы са скуры, каб некаму даказаць, што ў нас усё як у людзей: своечасова пабраліся шлюбам, своечасова нарадзілі дзяцей, своечасова вывучыліся, зрабілі кар'еру. Калі ж да пэўнага ўзросту не атрымліваем таго, што «належыць», значыць, жыццё не ўдалося. Цяпер я ведаю: гэта стэрэатып, які абвяргаюць вядомыя людзі, што дабіліся поспеху і прызнання ў сталыя гады. Напрыклад, Гаген пачаў пісаць свае творы ў 40 гадоў. Кінг Жылет вынайшаў бяспечную брытву таксама ў 40 і заснаваў кампанію «Жылет», якая вядомая ва ўсім свеце. І такія прыклады можна прыводзіць бясконца.

І ў 30 гадоў можна быць старым, стомленым, цынічным чалавекам без бляску ў вачах, плыць па волі лёсу. Мая сяброўка нядаўна закончыла курсы бізнесу і марыць адкрыць сваю, хоць невялікую, справу. Ідэй, задум у яе шмат. Таму, як бачыце, на пенсіі жыццё толькі пачынаецца! Было б жаданне...

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.** lazovskaya@zviazda.by

■ Фотазамалёўка



# ГАСПАДАРЫ,

## або Хуткая дапамога па прозвішчы Клімко



*Гэтую цудоўную сямейную пару наш фатограф «падлавіў» падчас абедзеннага перапынку. У іх двары, як у батанічным садзе, кветкі радуюць вока да позняй восені. А дом са звычайнага «фінскага», выдзеленага ў свой час сельскім медыкам, ператварыўся ў дагледжаны катэдж. Ды і жыўнасці на падвор'і нямала. «Сапраўдныя гаспадары», — так з павагай гавораць аднавяскоўцы пра Мікалая Іванавіча і Марыю Анатольеўну КЛІМКО. Гэтае азначэнне цалкам можна аднесці і да іх прафесійнай дзейнасці. Урачы агульнай практыкі Райцаўскай амбулаторыі, што ў Карэліцкім раёне, ведаюць кожнага старога ў наваколлі і ўсе іх балячкі. Дарэчы, амбулаторыя, якую ўзначальвае Мікалай Іванавіч, — адна з найлепшых медыцынскіх установ раёна. А ён сам гатовы ў любую хвіліну скокнуць у машыну хуткай дапамогі і імчаць туды, дзе чалавеку дрэнна.*

**Фота Аляксандра ШАБЛЮКА**

■ Кранальнае

# «ТОЛЬКІ НЕ БОЙСЯ...»

## Парады бабулі сваёй нованароджанай унучцы

**Калі б я магла напісаць гэты ліст раней для тваёй мамы, было б выдатна. Але тады мне споўнілася дваццаць пяць, і ні пра што такое я не задумвалася. Затое мела кучу іншых клопатаў: трэба было з раніцы накарміць дачку, адвезці яе ў садок, потым бегчы на лекцыі, а ўвечары яшчэ прыбраць дом і прыгатаваць вячэру. Твой дзед працаваў уночы, і не было каму мяне падмяніць, калі твая мама (а яна часта хварэла) плакала да самай раніцы. Ды і не ў адсутнасці часу справа. У дваццаць пяць ты можаш падзяліцца хіба што навыкамі прыгатавання яечні. Зрэшты, я не ўпэўнена, што ў мае гады я ведаю пра жыццё больш, чым тады. Але ўсё ж я твая бабуля, у нас (хочаш ты ці не) шмат агульнага, і я мару, каб ты была шчаслівая.**



**НЕ БОЙСЯ ПАДАЦЬ**

З ровара, з арэляў, з канькоў і нават на роўным месцы. Будзе балюча (часам моцна), але затое ты навучышся быць спрытнай, хуткай і падымацца нават тады, калі хочацца плакаць.

**НЕ БОЙСЯ КАЗАЦЬ ТОЕ, ШТО ДУМАЕШ**

Ты не абавязана маўчаць, калі табе штосьці не падабаецца ці ты з нечым нязгодная. Не ўтойвай сваё меркаванне ні дзеля «сяброўства», ні дзеля «кахання». Не траць словы на тых, хто іх не чуе. Калі цябе не чуюць ці не хочуць чуць, то нашто такія адносіны?

**НЕ БОЙСЯ ПРЫЗНАВАЦЬ СВАЕ ПАМЫЛКІ І ПРАСІЦЬ ПРАБАЧЭННЯ**

Толькі вельмі моцныя дзяўчаткі ўмеюць гэта. А ты ж вырасцеш менавіта такой. Невыносна цяжка сказаць: «Прабач, я не мела рацыі. Як я магу гэта выправіць?» Але калі ты гэтаму навучышся, ніхто не зможа цябе перамагчы.

**НЕ БОЙСЯ АТРЫМАЦЬ НІЗКУЮ АДЗНАКУ**

Не толькі ў школе. Двойка — гэта не так ужо і дрэнна. Затое ты даведаешся, дзе твае слабыя месцы і над чым варта папрацаваць. І памятай, што дрэнная адзнака не значыць, што дрэнная ты. Гэта ўсяго толькі матывацыя да дзеяння.

**НЕ БОЙСЯ ПРАЙГРАВАЦЬ**

Пройгрыш — як падзенне. Чым больш балюча, тым лепей. Калі ты прайграла (у алімпіядзе па біялогіі або ў барацьбе за самага прыгожага хлопчыка ў класе), гэта моцна павялічыла твае шанцы выйграць у наступны раз. Недарэмна ж кажуць, што людзі вучацца на сваіх памылках.

**НЕ БОЙСЯ ЗАКАХАЦЦА**

Гэта ўсё роўна аднойчы адбудзецца — так мы зроблены. Так што перастань супраціўляцца і радуйся таму, што нарэшце вырасла.

**НЕ БОЙСЯ СКАЗАЦЬ ЯМУ ПРА ГЭТА**

Што ты губляеш? Калі ён да цябе абыякавы, ты перастанеш пра яго думаць і знойдзеш таго, хто адкажа на твае пачуцці. А калі ўсё ж такі закаханы? Падумай сама. А мо ён таксама баіцца, што ты скажаш «не»? Тыя ж, хто гаворыць пра «жаночы гонар», проста табе зайздросцяць.

**НЕ БОЙСЯ ПЕРШАГА ПАЦАЛУНКА**

Павер бабулі, гэта цудоўна! А калі ты раптам хваляешся, што не ўмееш цалавацца і будзеш выглядаць, «як дурнічка», то ты і ёсць дурнічка. Усе жанчыны выдатна цалуюцца. Пацалункі ў нас у генах.

**НЕ БОЙСЯ ПЕРШАГА СЕКСУ**

Толькі, калі ласка, няхай гэта адбудзецца з тым, каго кахаеш. І памятай пра магчымыя наступствы.

**НЕ БОЙСЯ НЕ ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ**

Нават у мой час адсутнасць мужа не лічылася чымсьці жахлівым. Так што, калі ты падрасцеш, нікому не будзе справы да таго, ёсць у цябе на пальцы заручальны пярсцёнак ці не. А яшчэ я заўважыла, што не незамужнія сяброўкі жылі і жывуць не горш, чым я, а часам нават цікавей і весялей (не ўздумай сказаць пра гэта дзядулю).

**НЕ БОЙСЯ ВЫЙСЦІ ЗАМУЖ**

Чужынец на тваёй тэрыторыі — яшчэ той жах. Таму пастарайся сустрэць «свайго» чалавека, і тады ўсё атрымаецца, і нават нязакручаны ім цюбік зубной пасты і раскіданыя па ўсёй кватэры шкарпэткі не будуць раздражняць.

**НЕ БОЙСЯ НАРАДЖАЦЬ**

Хлусіць не буду, гэта балюча. Але гэта і самае цудоўнае, што можа быць у жыцці любой жанчыны.

**НЕ БОЙСЯ РАЗВОДУ**

У жыцці ўсякае здараецца. Галоўнае — не закрывацца ў сабе. Развод — гэта не канец жыцця. Гэта пачатак чагосьці новага і, хутчэй за ўсё, больш цікавага.

**НЕ БОЙСЯ БЫЦЬ МОЦНАЙ**

Магчыма, табе будуць казаць, што жанчына павінна быць (або прыкідвацца) слабай. Дык вось паслухай бабулю — не слухай нікога. Жанчыны нікому нічога не павінны. І толькі з такімі жанчынамі бываюць самыя моцныя і самыя лепшыя мужчыны.

**НЕ БОЙСЯ СПРАБАВАЦЬ НОВАЕ**

І ўсё роўна, колькі табе гадоў і што пра цябе скажуць людзі. Бяры ад жыцця ўсё, што яно прапаноўвае. І ўсё роўна, наколькі вар'яцкім выглядае збоку тваё жаданне. Напрыклад, калі ў пяцьдзясят табе прыйдзе ў галаву купіць сабе матаролер — не стрымлівайся. Некаторыя бабулі так і зрабілі.

**НЕ БОЙСЯ БЫЦЬ ДЗІЎНАЙ**

Я ж не баюся!

**НЕ БОЙСЯ СТАРЭЦЬ**

Гэта не страшна, хоць трохі дзіўна. Але затое пачынаеш больш шанаваць жыццё (ну, прабач, што я банальная), мацней любіць і шкадаваць блізкіх і пісаць вялізныя лісты ўнукам.

**НЕ БОЙСЯ СТРАЧВАЦЬ БЛІЗКІХ**

Я доўга сумнявалася, ці варта табе гэта пісаць. Але мы ж з табой ведаем, што страты і растанні непазбежныя. Таму любі сваіх блізкіх, пакуль яны побач, так моцна, як толькі зможаш. Людзі сыходзяць — але любоў не знікае

■

# У ПАЎЛІНАВА НЕ ДА БОХВІЦАЎ

**Узбіраемся па прыступках на другі паверх старога сядзібнага дома. Хоць, калі падумаць, не такога ўжо старога: год пабудовы — 1906-ты. Яшчэ не ведаем, што нас чакае там, наверсе. Якія канелюры і кесоны хаваюцца пад мініяцюрнымі неагатычнымі вежачкамі...**



Фотаздымкі вандроўнікаў-папярэднікаў, размешчаныя ў сеціве, вядома, дапамагаюць. Ствараюць першае, завочнае, ўражанне — раз. Выстаўляюць папярэднія арыенціры — два. Падштурхоўваюць скласці план асабістых прыгод — тры. Увогуле, даюць магчымасць уважыць мэтазгоднасць канкрэтнага падарожжа. Але гэта ўсё — «умоўна кажучы». Ну вось якая, каб папытаў, карысць была ад прагляду фотаздымкаў Радзівілімонтаў? У выніку прыехалі блукаць у крапіве. Ну, яшчэ са слімакамі мясцовымі пераznаёміліся. Важныя такія. Але што яны памятаюць, тыя слімакі, калі жывуць толькі дзесяць гадоў? А сядзібы няма. Ня-ма. Як не было. Які быў сэнс збірацца? Тое самае: навошта было перапісваць каардынаты Начы Свяніцкай? Яе таксама не існуе. Але ж купілася, наіўная, на прозвішча Свянціцкіх.



**Сядзіба ў Паўлінаве на дарэвалюцыйным фотаздымку. Справа — неіснуючая сёння каплічка.**

## *Паслядоўнікам*

*Звычайна вандроўку ў Паўлінава сумяшчаюць з вандроўкай у Флер'янова ў Ляхавіцкім раёне — яшчэ адну сядзібу Бохвіцаў, у якой таксама бывала Эліза Ажэшка. У апошняй Бохвіцы ўладкоўвалі на лета пансіянат, у якім пісьменніца, хворая, усяго за два гады да смерці, не проста адпачывала, а наладжвала цэлыя літаратурныя, музычныя, тэатральныя і фларыстычныя імпрэзы. Пялёсткамі кветак, сабраных у Флер'янове, пісьменніца «падпісвала» свае лісты. Што цікава, флер'яноўскія неагатычныя вежачкі пераклікаюцца з паўлінаўскімі. Сядзіба цяпер мае гаспадара, і таму як быццам збольшага дагледжана. Але праз вокны ў ёй выглядваюць сучасныя жалюзі, вертыкальныя паверх гарызантальных, а пры ўваходзе чытаецца шыльдачка «Клуб ветэранаў».*

Усё таму, што з некаторай пары мяне вельмі цікавіць лёс Элізы Ажэшкі. А яна, як вядома, збіралася замуж за Свянціцкага з імем Зыгмунт, доктара, і нават вучыла з той нагоды лаціну і цікавілася батанікай. Са Свянціцкім у яе шлюб не адбыўся, а лацінай і батанікай яна працягвала захапляцца. Інакш кажучы, гэта гісторыя пра тое, як інтарэс аднаго члена вялікай сям'і можа зрабіцца падставай для цэлай серыі сямейных падарожжаў. Прынамсі, на гэтыя 53.027648 паўночнай шыраты і 25.816376 усходняй даўгаты праз ліпавую алею ўздоўж ваенных аб'ектаў пад гукі вучэбных стрэлаў і недарэчныя каментары буркуна Арчы (чытач, ты ж яшчэ не забыўся, што Арчы — навігатар?) нас усіх, літаральна цэлую сям'ю, пацягнуў менавіта той факт, што тут гасцявала пані Эліза. Нават малодшага члена «экспедыцыі», Паўлічка, цікавілі не толькі вялізныя, вышэй за яго, карані вывернутага побач дрэва, але і наша авантурнае перамяшчэнне не на сто гадоў назад праз адзінае не забітае дошкамі акно на першым паверсе сядзібнага дома з мініяцюрнымі неагатычнымі вежачкамі.

Мы ў Паўлінаве пад Баранавічамі, у доме, які Ян Ота (у польскіх крыніцах — Jan Otto) Бохвіц, сын Фларыяна і бацька Тадэвуша, пабудаваў, каб назваць у гонар маці, Паўліны. Апошняя — сваячка Адама Міцкевіча (адны кажуць, што цётка, другія — што кузіна, але часам гэта адно і тое ж, ці не так?). Яе муж Фларыян — адвакат па адукацыі, педагог па прызванні і філосаф па веравызнанні. Творы гэтага чалавека — пра форму і сутнасць мыслення, асновы пачуццяў і думак — выходзілі ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Іх, дарэчы, варта прачытаць. Ян Ота — удзельнік паўстання 1863-1864 гадоў. Смяротнае пакаранне яму некалі замянілі на ссылку. А Тадэвуш... Ну, Тадэвуша ўсе ведаюць — як гісторыка журналістыкі і сябра Элізы Ажэшкі па перапісцы.

Гэта мы з гаспадарамі пазнаёміліся.

Узбіраемся, значыцца, па прыступках на другі паверх.

Трошкі баімся — хто ведае, наколькі прыступкі надзейныя? Але што ні крок, то ногі ступаюць смялей. Звычайная справа, кожны раз так. Бо зваліўшся ці не — гэта ж яшчэ пытанне, а да мэты лепш заўсёды быць бліжэй.

Баяліся, як у выніку стала вядома, абсалютна дарэмна: гэтую лесвіцу з месца не зрушыць. Далібог. Хацелася адламаць на памяць кавалак асновы балюстрады — дзе там! А з іншага боку (калі ведаць, што тут у савецкі час размяшчаўся шпіталь), ці памятае гэтая балюстрада Бохвіцаў і Ажэшку?

Пані Эліза... Яна таксама прыязджала сюды на аўтамабілі. Проста на адзінаццаць з паловай дзесяцігоддзяў раней за нас. Мо і паркавалася на тым самым месцы, дзе прыпаркаваліся мы, — перад флігелем. Не сама, праўда, — аўтамабіль належаў сябру, Юзафу Рэйтану.

Недзе тут яна сфатаграфавалася з сівабародым гаспадаром, Янам Ота Бохвіцам. На здымку яны сядзяць на лаўцы пры доме, пад акном. Хочацца адшукаць тую лаўку! Хочацца думаць, што лаўка тая стаяла... Вось тут! З боку ранейшага сада, на колішняй тэрасе, з рэшткаў якой мы і трапілі праз адзінае незабітае, упрыгожанае прамавугольным «начолкам» акно на першы паверх палаца.

Цяпер прабраліся на другі. Выглядваем у сад праз стральчатыя вокны, здзіўляемся ўнутраным, таксама стральчатага фасону, перагародкам.

Палац у Паўлінаве, як пісаў даследчык Раман Афтаназы, хутчэй нагадваў вілу, чым традыцыйную сядзібу таго часу. Тэрасу добра відаць на дарэвалюцыйным фотаздымку. З правага боку, як частка дома, — каплічка з увянчанай крыжам тонкай вежачкай. Цяпер каплічкі няма.

## *Рамантыкам*

*Крыўдна будзе не заехаць яшчэ і ў Грушаўку ў Ляхавіцкім раёне — вёску, адкуль родам Юзаф Рэйтан. Гэта на яго аўтамабілі ладзіліся сто з нечым гадоў таму туры па сядзібах з удзелам Ажэшкі і яе сяброў. Не так уражвае сядзіба, як капліцка-пахавальня. І не толькі храством яна ўражвае. Справа ў тым, што Рэйтаны, наколькі вядома, не мелі фамільнай крыпты. І толькі калі Юзаф Рэйтан у 1910-м памёр ад хваробы (Ажэшка, між іншым, памерла ў той самы год), спецыяльна для яго пахавання быў узведзены шыкоўны склеп. Выключны выпадак у шляхецкім асяродку.*

А з другога паверха можна трапіць на трэці, мансарды. Убачыць, куды і як вёў дымаход каміна, пры якім не можа быць, каб не сядзела, грэючы плечы, 68-гадовая пані Эліза. Або Тадэвуш Бохвіц чытаў тут чарговы ліст ад яе. Ліст-споведзь ці ліст-біяграфію. «З таварышамі па пяры кантактавала вельмі мала і нічога не брала ў іх ні добрага, ні кепскага. Узяла тое з кніжак, уласнага іх асмыслення». «Жыла самотна, і нічога мне не перашкаджала. Пасля цэлага дня пісання для адпачынку пачынала чытаць. І вельмі часта закрывала кнігу тады, калі пры дагараючай лямпе пакой залівалі белы світанак або залаты бляск узыходзячага сонца». Праўду кажучы, што ў эпісталярнай спадчыне Элізы Ажэшкі хаваецца палова яе літаратурнага таленту.

Вяртаемся да рэальнасці, зноў праз акно. Нам застаецца даследаваць флігель і парк. І тады можна будзе вяртацца дамоў. Ісці ў бібліятэку, шукаць патрэбны том у шматтомным выданні з лістамі пані Элізы — і чытаць, чытаць, чытаць... Пакуль не натрапіць вочы на які-небудзь новы тапонім, які ўладна пакліча ў чарговае падарожжа.

Падарожнічала
Святлана ДЗЯНІСАВА.

## ■ Што бывае

### НАЗІРАННІ

*➤ Шлях да старой сядзібы заўсёды можна пазнаць, нават калі навігатар, як наш, закапрызіць. У тым, што рухаецеся ў правільным кірунку, вас пераканае ўзорна роўная, нязвыкла вузкая алея са старых дрэў, абавязкова таполяў або ліпаў. Ну і ваш аўтамабіль неяк непрыкметна ператворыцца ў які-небудзь шыкоўны дыліжанс.*

*➤ Некаторыя буслы стаяць пры дарозе, як у глебу ўкапаныя. Доўга-доўга не варушацца. І часам прабягае думка: мо штучныя? Бо калі бачыш сапраўднага бусла, душа спявае, а калі бачыш штучнага, то ўражанне такое самае, як ад кветак, вырабленых з пластыкавых бутэлек. Навошта краіне буслоў бусліны сурагат?..*

### БЯЗГЛУЗДЗІЦА

*— Наперадзе па курсе — Целяханы! Што гэта нам дае?*

*— Дай падумаю, што гэта можа нам даць. Па-першае, паказальнік на Целяханы можа мець выгляд лыжных палак, утыркнутых у зямлю. І надпіс «Целяханы» можа быць нанесены не на шыльду, а на ўласна лыжы. Цур, я фатаграфуюся першая! Што яшчэ?*

*— Недзе побач — білборд, які запрашае наведаць унікальны беларускі музей лыжаў! Ну, і сам музей лыжаў.*

*— І крамка, у якой гандлююць стылізаванымі лыжамі! Лыжамі-нататкамі, лыжамі-алоўкамі, лыжамі-рамкамі для фота, лыжамі-календарамі, лыжамі-цукеркамі, лыжамі-пернікамі і — няхай сабе і так — лыжамі-магнітамі. Я куплю сабе лыжы-шакаладку!*

*Карацей, на пытанне, што гэта нам дае, можна адказаць так: надзею на яшчэ адну цікавую экскурсію! Але...*

*Надзея надзеяй і засталася. І прыкра, што так. Бо мог бы населены пункт, імя якога на ўвесь былы СССР гучала ў звязцы з лыжамі, парупіцца пра якое-ніякое брэндаванне.*

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

20 верасня ў Мёрах — экалагічнае свята, прысвечанае жоравам і журавінам. Кажуць, мясцовае балота Ельня — самае багатае на ягады, названыя ў гонар птушкі, а птушак з такім імем тут штогод чатыры тысячы адпачывае. У іх гэта называецца «асенняя міграцыя». У дачыненні да ягад абвяшчаецца зноў-такі асенняя нарыхтоўка. Журавіны прынята захоўваць свежымі — для зімовых морсаў. Але паспрабуйце зварыць з іх варэнне: смак — не адарвацца.



**26 і 27 верасня ў Мінску — «Хіган», фестываль анімэ і іншых праяў усходнеазіяцкай культуры. У кошт білета, аднаго на два дні, уваходзіць шмат што: двухдзённая касцюмаваная праграма, магчымасць наведвання розных выстаў, кірмаш кніг і коміксаў, харчаванне ў кавярні (японскія прысмакі і локшына), а таксама пакет сувеніраў. Месца дзеяння — КЗ «Мінск».**

Батанічны сад Маскоўскага ўніверсітэта (пад назваю «Аптэкарскі гародчык») запрашае на фэст «Фарбы восені». Ажно да 11 кастрычніка можна сустракацца там з мастакамі і фатографамі, дызайнерамі і фларыстамі, слухаць музыку, дыхаць водарам хрызантэм і секвояў, частавацца малінавым варэннем і пірагамі з гарбуза.



**Фэст селядцоў у Фінляндыі адкрываецца 4 кастрычніка ў Хельсінкі. Там вам трэба знайсці рынкавую плошчу, дзе селядцы будуць панаваць у салёнай, паўсалёнай, слабасалёнай і іншых кандыцыях, пад соусам, з гарчыцай і ў марынадзе. Фэст праводзіцца з 1743 года, але селядцы ніколі не падводзяць!**

19 верасня роўна ў поўдзень сам мэр Мюнхена асабіста адшпунтуе бочку з півам, а потым прыгажуня са званочкам у руцэ, седзячы на ўпрыгожаным кані, пачне прывітальнае шэсце. Вы не забыліся? Стартуе Актобарфэст! У праграме, як мінімум, — паспытаць смачнага піва, паглядзець на пародзістых коней, наесціся смажаных курант.



**10 кастрычніка ў Італіі руляць качкі! Падзея не зусім кулінарная, хутчэй спартыўная: качкі бегаюць навыперадкі адна з адной, а людзі робяць стаўкі і ў чаканні вынікаў частуюцца італьянскімі нацыянальнымі стравамі.**

# З ІГОЛКІ ХЛЕБ КОЛКІ?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

Прыехалі дзед з бабкай пасля лагера ў 1948 годзе. Выбралі для месца жыхарства Маларыту. Бо вярнуцца на сваю малую радзіму дзед не меў права, там была памежная зона. Тут нарадзіліся іх дзеці. Адна з дачок, мама Алены Талашкі, і сёння жыве ў Маларыце. Менавіта яна і навучыла маленькую Алену азам шыцця на дамашняй машынцы.

Для маёй суразмоўцы з маладых гадоў не было праблемай змайстраваць сукенку альбо мужчынскую кашулю, нагавіцы. Раней, калі дзеці толькі падрасталі, з задавальненнем шыла ім нейкія эксклюзіўныя рэчы. Але гэта былі звычайныя клопаты гаспадыні і маці. Пакуль не з'явілася першая лялька...

## «ЛЯЛЬКУ МОЖНА ПАДАРЫЦЬ ЖАНЧЫНЕ... ЛЮБОГА ЎЗРОСТУ»

Тады Алена Аляксандраўна зразумела, што ствараць лялькі — гэта зусім іншы ўзровень майстэрства, умення, натхнення. З імі яна ніколі не стамляецца, нават калі даводзіцца сядзець некалькі гадзін запар у адной позе. Наадварот, пасля заняткаў любімай справай адчувае нейкі прыліў энергіі. Некаторыя лялькі з яе калекцыі ўжо знайшлі новых гаспадароў у Германіі, Грэцыі, ЗША, іншых краінах. Многа сваіх работ аўтар падарыла сябрам і знаёмым.

**«Калі шыеш звычайную рэч для чалавека, надзеленага дабрынёй, унутраным святлом, спадніца ці жакет атрымліваюцца хутка, на адным дыханні. Для таго, у каго характар складаны, рэч робіцца доўга, многае не ўдаецца адразу, даводзіцца папраўляць і перарабляць».**

Аднойчы мужчына папрасіў зрабіць ляльку, каб падарыць яе жонцы на дзень нараджэння. Яна спытала, колькі гадоў палавінцы. «52», — адказаў той. Тады яна ўпершыню зразумела, што ляльку можна падарыць жанчыне любога ўзросту. Раней аб тым не задумвалася.

Сапраўды, яе лялькі — гэта ж цэлыя вобразы. Кожная з іх, як правіла, пачынаецца з маленькай дэтальკі. Ну, напрыклад, убачыла ў цацачнай краме невялікую гітару. А ў галаве нарадзіўся вобраз стыльнай дзяўчыны-рэперкі ва ўсім чорным. Ну і пачалі шыцца сукенка з усімі аксесуарамі і шматлікімі дэталямі, вырабляцца абутак ды іншае. Абутак — самае цяжкае, прызнаюцца некаторыя калегі-майстры. Алена гаворыць, што насамрэч нічога асаблівага няма. Ёй удаюцца любыя чаравікі, якія падыходзяць той ці іншай лялькі. А вось валасы зрабіць для сваіх мадэляў — сапраўды рэч не вельмі простая.

Алена Аляксандраўна з усмешкай успамінае нядаўні тэлефонны дыялог з мужам. Вечарам ён набраў яе нумар і пацікавіўся, чым займаецца.

— Валасы вару, — адказала жонка.

— Добра, што нас ніхто не чуе, — засмяяўся муж. — А то спачуваць мне сталі б. Маўляў, жонка трохі не ў сабе.

Да яе захаплення муж ставіцца з разуменнем. І ўмее парадавацца, калі жонка ўдзельнічае ў якой-небудзь выставе і прывозіць адтуль узнагароду.

Алену Талашку час ад часу запрашаюць на выставы ў сталіцу, у Брэст. Там, бывае, знаходзіцца пакупнік на яе творы. Але больш лялек яна робіць для сябе, сяброў і знаёмых. Дома ў яе сабраны цэлы стол будучых нарыхтовак. Пра гітару ўжо гаварылася, ёсць яшчэ маленькая скрыпачка, якая чакае свой вобраз. На падыходзе дзве лялькі ў беларускіх нацыянальных строях — Ясь і Яніна. Ім стварае кампанію вельмі прыгожая навагодняя дзяўчынка.

**Папрасілі неяк Антона зрабіць чырвона-чорны ўзор. Ён адмовіўся, сказаў, што гэта ўкраінская традыцыя. У нас такіх узораў раней не было.**









— Калі робіш ляльку для некага, — расказвае Алена Аляксандраўна, — то адчуваеш характар заказчыка. Нават калі шыеш звычайную рэч для чалавека, надзеленага дабрынёй, унутраным святлом, спадніца ці жакет атрымліваюцца хутка, на адным дыханні. Для таго, у каго характар складаны, рэч робіцца доўга, многае не ўдаецца адразу, даводзіцца папраўляць і перарабляць. Не ведаю, чым гэта растлумачыць, але так ёсць. Нездарма мая бабуля казала: «З іголкі хлеб колкі». Значыць, работа шаўца ніколі не была лёгкай.

А з лялькамі, якія ствараюцца не на заказ, а па натхненні, усё інакш. Іх рабіць цікава. А тое, што цікава, прыносіць задавальненне. Як прыносіць цяпер задавальненне вышыўка яе сыну Антону.



## «МНЕ НЕ ПАДАБАЕЦЦА, КАЛІ МАЕ КАШУЛІ НАЗЫВАЮЦЬ «ВЫШЫМАЙКАМІ»

Пачыналася яго хобі з машынкі. Алена Аляксандраўна купіла вышывальную машынку з праграмным забеспячэннем. Антон, тады студэнт тэхнічнай ВНУ, узяўся разбірацца з праграмамі. Яму было цікава, як гэтая машына працуе, што можна на ёй зрабіць. Хлопец пачаў вышываць хутчэй для забавы. А потым у яго атрымалася нешта цікавае. На звычайнай футболцы вышыў арнамент і зразумеў, што гэта прыгожа. Вядома, спачатку ўсё рабілася з мамінай дапамогай.

**Маці вельмі рада, што сын мае намер застацца побач, лічыць, што мужчына павінен жыць там, дзе яго карані. Не варта ўсім чапляцца за сталіцу і вялікія гарады, жыць можна камфортна і ў глыбінцы.**

Далей — болей. Антон стаў вывучаць асаблівасці маларыцкага народнага строю. Для гэтага ў Маларыцкім раённым цэнтры народнай творчасці ёсць шмат магчымасцяў. Там сабраны ўзоры народнага касцюма з многіх вёсак раёна. Антон кансультаваўся са спецыялістамі цэнтра, вывучаў спецыяльную літаратуру. Маларыцкі строй захапіў яго сваім харастом. Тутэйшыя ўзоры асаблівыя, іх нідзе больш не сустрэнеш.

Хлопец заўважыў, што ў мужчынскіх арнаментах часцей сустракаюцца кветкі, а ў жаночых больш геаметрыі. І кожная фігурка мае сваё значэнне. Так, выява птушкі ў арнаменце азначае, што жанчына абавязкова пакідае роднае гняздо. Сваімі фігурамі пазначаны прыгажосць, маладосць, дзявочая чысціня.

Антон Талашка вельмі сур'ёзна ставіцца да пераносу ўзораў на сучасныя вырабы. Лічыць, што імправізацыя ў многіх выпадках не да месца. Напрыклад, папрасілі неяк Антона зрабіць чырвона-чорны ўзор. Ён адмовіўся, сказаў, што гэта ўкраінская традыцыя. У нас такіх узораў раней не было.

У згаданым цэнтры народнай творчасці захоўваецца калекцыя народных строяў, якім каля ста, а то і больш за сто гадоў. Таму вывучаць народныя традыцыі можна па арыгіналах. Што і робіць вышывальшчык-аматар з Маларыты.

Антон, дарэчы, цярпець не можа слова «вышымайкі», якое нядаўна з'явілася ў кантэксце моднай тэндэнцыі адзення. Для яго прывычным бачыцца слова «кашуля». Паводле сцвярджэння Антона, найлепшай тканінай для адзення быў і застаецца лён. Зімой ён грэе, летам ахаладжвае. І вышываць на льняной тканіне народныя арнаменты і прыемна, і цалкам лагічна.

Цяпер Антон вышывае асобныя вырабы на заказ. Пасля таго, як некаторыя ўзоры адзення з'явіліся ў інтэрнэце, яму заказваюць футболкі ў этнастылі. Вышывае і для сябе, сваёй сястры.

Пасля заканчэння Гомельскага тэхнічнага ўніверсітэта хлопец вярнуўся ў родны горад, уладкаваўся на працу. І маці вельмі рада, што сын мае намер застацца побач. Алена Аляксандраўна лічыць, што мужчына павінен жыць там, дзе яго карані. Не варта ўсім чапляцца за сталіцу і вялікія гарады, жыць можна камфортна і ў глыбінцы. Дачка Талашкаў — Даша — пакуль вучыцца і працуе ў Польшчы. Далей будзе відаць, як кажа маці. Дар'я таксама творчы чалавек, яна з задавальненнем робіць карціны і пано з кветак. Можа і пашыць нешта пад настрой. Ствараць прыгажосць сваімі рукамі — гэта іх сямейнае хобі.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**
*yackevich@zviazda.by*
*г. Маларыта.*

■ Маміны дзённікі

# КАРОБКА ДЗЯЦІНСТВА

**Калі рэчаў дзіцяці, якія хацелася б захаваць, стала зашмат, я вырашыла — прыйшоў час для стварэння «Каробкі дзяцінства». У мяне самой не было такой каробкі, але засталіся коўдрачкі, якія мама шыла маім лялькам, падстаўка пад кнігі, школьныя дзённікі... Калі бяру іх у рукі, час як быццам спыняецца, і я ўмомант пераношуся ў бесклапотнае дзяцінства, узгадваю, якой была, чым жыла, кім стала... Рэчы з майго дзяцінства саграваюць, напаўняюць, радуюць...**

Для сваіх дачок я зрабіла дзве каробкі дзяцінства, яны ўжо амаль поўныя. Што ў іх? Глядзіце самі (больш здымкаў шукайце на сайце «Звязды». — **Рэд.**) — тут ёсць амаль усё: ад першай бразготкі да першага абутку. А яшчэ — першыя зубныя шчоткі, кніжкі-малышкі, лыжкі-відэльцы, бутэлечка ад першых духоў, першыя нататкі і фартух, мае «цяжарныя» нататкі, бірачкі з радзільні і кашулькі, у якіх хрысцілі Аню і Дашу (я іх надзявала, калі дзяўчаткі хварэлі), першая падрэзаная грыўка Ані. У каробцы захаваліся і маленькія плакаты, якія віселі ў дзіцячым пакоі нейкі час. Аднойчы маленькая Ганначка непрыкметна для нас выкінула з акна татаў футбольны мяч. Самае цікавае, што мы з мужам бачылі, як гэты мяч тут жа падабраў хлапчук з мамай і знік у невядомым кірунку. Але не адразу здагадаліся, што гэта наш. А Ганначка, пэўна, пабаялася прызнацца, і толькі праз гадзіну мы зразумелі, што давядзецца набываць новы. Пасля гэтай гісторыі ў дзіцячым пакоі з'явіўся плакат «Маленькая хлусня нараджае вялікі недавер». Цікава ўзгадваць гэта і назіраць, як дачка выкарыстоўвае тую фразу датычна іншых, напрыклад сваёй сястры. У каробцы ёсць аранжавыя паперкі, на якіх мы разам з гасцямі, калі Анюце споўніўся годзік, прагназавалі яе будучыню, меркавалі, кім яна стане. Свістулька-рыба, якую я атрымала падчас гульні «Таемны Дзед Мароз», і неўзабаве зацяжарала Дашай (а рыбы па ўсякіх там знаках — да цяжарнасці).





Мае дочкі любяць перабіраць рэчы з гэтых каробак. Я стараюся даставаць іх вельмі рэдка, каб павысіць цікавасць. Вельмі спадзяюся, што каробкі дзяцінства будуць ім цікавыя і праз 20 гадоў. Але калі гэтага не здарыцца, то тады я буду настальгаваць па сваім мацярынстве, з радасцю і ўсмешкай узгадваючы самыя памятныя дні, сумесныя справы і падзеі, якія можна перажыць толькі ва ўспамінах...

**Наталля СЯЛЕЦКАЯ. Фота аўтара**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПЕРВЫХ И ПОВТОРНЫХ ОТКРЫТЫХ АУКЦИОНОВ ПО ПРОДАЖЕ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ В ЧАСТНУЮ СОБСТВЕННОСТЬ

**Организатор аукционов: Коммунальное консалтинговое унитарное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, дом 5, тел. (0212) 42-61-62**

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №221288500101000228 площадью 0,1093 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Андроновичи, пер. Дачный для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 49 527 000 бел. руб. **Размер задатка:** 4 952 000 бел. руб. |
| Лот №2. Земельный участок с кадастровым №221288500101000227 площадью 0,1494 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Туловский с/с, д. Андроновичи, ул. Центральная, уч. №1 для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 67 698 700 бел. руб. **Размер задатка:** 6 769 000 бел. руб. |
| Лот №3. Земельный участок с кадастровым №221288108101000308 площадью 0,1457 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 9А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 63 304 950 бел. руб. **Размер задатка:** 6 330 000 бел. руб. |
| Лот №4. Земельный участок с кадастровым №221288108101000307 площадью 0,1456 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 11А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 63 261 400 бел. руб. **Размер задатка:** 6 326 000 бел. руб. |
| Лот №5. Земельный участок с кадастровым №221288108101000306 площадью 0,1476 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Витебский р-н, Октябрьский с/с, аг. Октябрьская, ул. Оршанская, 13А для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 64 130 500 бел. руб. **Размер задатка:** 6 413 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 22.10.2015 в 15.00 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 17.09.2015 с 8.30 по 21.10.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** возместить убытки, причиняемые нарушением функционирования мелиоративных сооружений в сумме: 12 879 000 бел. руб. (по лоту №3), 12 870 150 бел. руб. (по лоту №4), 13 046 950 бел. руб. (по лоту №5); получить тех. документацию и разрешение на строительство жилого дома; приступить к занятию зем. участка в соответствии с целью и условиями его представления (начать строительство) не позднее 1 года со дня гос.регистрации зем. уч-ка (по лотам №№1, 2) со дня проведения аукциона (по лотам №№3–5); осуществить строительство жилого дома в сроки, определенные ПСД; снять, сохранить и использовать плодородный слой почвы согласно ПСД.<br>**Реквизиты для внесения задатка:**<br>**По лотам №1–2:** р/с 3600314130148 ф-л №200 Витебского обл.управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300971263, код платежа 4901, получатель платежа: Туловский сельисполком.<br>**По лотам №№3–5**: р/с 3600314110126 в ф-ле №200 Витебского обл. управления ОАО «АСБ Беларусбанк» МФО 635, УНП 300962400, код платежа 04901, получатель платежа Октябрьский сельисполком. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №220888119101000162 площадью 0,1495 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Браславский р-н, Слободковский с/с, д. Муражи, участок №36 – земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме) – для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона особо охраняемых природных территорий (ГПУ «Национальный парк «Браславские озера»); водоохранная зона водного объекта (озеро Неспиш); охранная зона линий электропередачи напряжением до 1000В. **Начальная цена**: 12 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 200 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения повторного аукциона:** 02.10.2015 в 14.15. по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 106 в Браславском РДК. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 17.09.2015 с 8.30 по 01.10.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни; 02.10.2015 с 11.00 до 13.00 по адресу: по адресу: г. Браслав, ул. Советская, 106 в Браславском РДК. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. Извещение опубликовано в газете «Звязда» от 24.07.2015. **Условия аукциона:** разработать и утвердить ПСД и разрешение на строительство объекта в срок, не превышающий 2 года; произвести занятие (освоение) зем.участка не позднее 1 года со дня утверждения проектной документации на строительство жилого дома; до начала строительства снять на зем.участке плодородный слой почвы в местах размещения строений и сооружений и использовать его в соответствии с проектной документацией. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600312080005 ЦБУ №205 г. Браслав ф-л №214 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Новополоцк код 150801660, УНП 300594330, код платежа 04901. Получатель платежа: ГУ МФ РБ по Витебской области. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №240100000001013215 площадью 0,0824 га, расположенный по адресу: Витебская обл., г. Витебск, ул. 1-я Поселковая, 3А для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения: охранная зона сетей и сооружений газоснабжения. **Начальная цена**: 73 871 490 бел. руб. **Размер задатка:** 7 387 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 27.10.2015 в 16.00. по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». **Срок внесения задатка и приема документов:** с 17.09.2015 с 8.30 по 26.10.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» в рабочие дни с 8.30 до 17.30. Для участия в аукционе приглашаются граждане и негосударственные юр.лица Республики Беларусь. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3642302000280 в ф-ле № 200 Витебское обл. управление ОАО «АСБ Беларусбанк», код 635, УНП 300200386, получатель платежа: Витебский городской исполком. **Условия аукциона:** получить разрешения на проведение проектно-изыскательных работ и разработки строительного проекта на строительство объекта в срок, не превышающий 3 месяца, с момента гос.регистрации права на зем.участок; в течение 6 месяцев (для юр. лиц) и 1 года (для граждан) со дня утверждения проектной документации на строительство объекта приступить к занятию зем.участка; осуществить строительство объекта в сроки, определенные ПСД. |

| Кадастровый номер, площадь, адрес, функциональное назначение земельного участка |
|---|
| Лот №1. Земельный участок с кадастровым №222180409601000041 площадью 0,1498 га, расположенный по адресу: Витебская обл., Докшицкий р-н, Березинский с/с, д. Осетице, д. 7Б для строительства и обслуживания жилого дома. Ограничения, инженерные коммуникации и сооружения отсутствуют. **Начальная цена**: 10 000 000 бел. руб. **Размер задатка:** 1 000 000 бел. руб. |
| **Дата, время и место проведения аукциона:** 19.10.2015 в 12.00 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. **Срок внесения задатка и приема документов:** с 17.09.2015 с 8.30 по 16.10.2015 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга» с 8.30 до 17.30 в рабочие дни; 19.10.2015 с 09.00 до 11.00 по адресу: г. Докшицы, ул. Ленинская, 31 в Докшицком райисполкоме. Для участия в аукционе приглашаются граждане Республики Беларусь. **Условия аукциона:** получить тех. документацию на жилой дом и разрешение на его строительство в срок, не превышающий 1 года; в течение 1 года со дня получения свидетельства (удостоверения) о гос. регистрации создания зем. участка и возникновения права на него приступить к занятию данного участка в соответствии с целью и условиями его предоставления (начать) строительство; завершить строительство объекта в сроки, определенные проектной документации. **Реквизиты для внесения задатка:** р/с 3600317026608 в ЦБУ №209 г. Докшицы филиала №216 ОАО «АСБ Беларусбанк» в г. Полоцк, код 648, УНП 300013901, код платежа 4901. Получатель платежа: Березинский сельисполком. |

Аукционы проводятся в порядке, установленном Положением о порядке организации и проведения аукционов по продаже земельных участков в частную собственность, утвержденным Постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 26.03.2008 №462. В аукционе допускается участие консолидированных участников (двух и более граждан, юр. лиц). **Для участия в аукционе** гражданин, юр. лицо подают заявление об участии в аукционе, представляют документ, подтверждающий внесение суммы задатка на р/счет, указанный в извещении, с отметкой банка, заключают с организатором аукциона соглашение о правах, обязанностях и ответственности сторон в процессе подготовки и проведения аукциона. Представляются: гражданином копия документа, содержащего его идентификационные сведения, без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина нотариально удостоверенная доверенность; представителем или уполномоченным должностным лицом юр. лица – доверенность, выданная юр. лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих гос. регистрацию юр. лица без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юр. лица; консолидированными участниками оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе. При подаче документов на участие в аукционе граждане предъявляют паспорт гражданина РБ, а представители граждан и юр. лиц, уполномоченные должностные лица юр. лиц – документ, удостоверяющий личность. При подаче документов уполномоченное лицо предъявляет доверенности, выданные гражданами, юр. лицами, заключившими договор о совместном участии в аукционе. **Условия аукциона: победитель аукциона, единственный участник несостоявшегося аукциона обязан:** в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо после признания аукциона несостоявшимся внести плату за зем. участок и возместить затраты на организацию и проведение аукциона в т.ч. расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам аукциона документации, необходимой для его проведения; обратиться за гос. регистрацией права на зем. участок в двухмесячный срок со дня проведения аукциона. Инженерные коммуникации и сооружения на зем. участках отсутствуют. Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории устанавливаются проектной документацией. Назначение зем.участков в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: зем. участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по гос. регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме). Аукцион состоится при наличии не менее 2-х участников. Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Всем участникам предоставляется право ознакомления с земельно-кадастровой документацией, а также возможность осмотра на местности земельного участка. **Конт.тел.: (0212)42-61-62, (029)510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru; www.marketvit.by.**

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ТОРГОВ В ФОРМЕ ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА

**Продавец: ОАО «КУПЦОВЪ», 211793, Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1, (029) 509-02-27.**

**Организатор торгов: государственное предприятие «Витебский областной центр маркетинга», 210015, г. Витебск, проезд Гоголя, 5, (0212) 42-61-62.**

| |
|---|
| **Лот №1.** Изолированное помещение с инвентарным №220/D-5038 общей площадью 1433,7 кв.м, наименование – склад готовой продукции, назначение – производственное помещение, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1-Б, пом. 2 на зем. участке с кадастровым №221550100001004849 площадью 0,7453 га. **Начальная цена: 1 507 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 150 750 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 75 375 000 бел. руб.** |
| **Лот №2.** Капитальное строение с инвентарным №220/С-26382 общей площадью 1266,8 кв.м, наименование – здание прирельсового склада, назначение – здание специализированное складов, торговых баз, баз материально-технического снабжения, хранилищ, расположенное по адресу: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Железнодорожная, д. 6 на зем. участке с кадастровым №221550100010000162 площадью 0,2966 га. **Начальная цена: 765 000 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 76 500 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 38 250 000 бел. руб.** |
| **Лот №3.** Ленточный пресс Flottweg с дробилкой и насосами, 2009 г. в., инв. №1170 (дополнительное оборудование: бункер под дробилку Flottweg, объем 0,5 м³, 1993 г. в., инв. №1655). Местонахождение: Витебская обл., Глубокский р-н, г. Глубокое, ул. Ленина, д. 1. **Начальная цена: 1 609 920 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 160 992 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 80 496 000 бел. руб.** |
| **Лот №4.** Гомогенизатор А1-ОГ2М (инв. №9014). **Начальная цена: 35 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 3 550 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 775 000 бел. руб.** |
| **Лот №5.** Косилка роторная Z-173/1 (инв. №1023). **Начальная цена: 16 100 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 1 610 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 805 000 бел. руб.** |
| **Лот №6.** Машина термоусадочная Profipack PR700 (инв. №2012). **Начальная цена: 62 200 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 6 220 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 110 000 бел. руб.** |
| **Лот №7.** Машина передвижная дождевальная ПДМ-2500 (инв. №9043). **Начальная цена: 173 400 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 17 340 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 8 670 000 бел. руб.** |
| **Лот №8.** Рефрижераторный контейнер (инв. №474). **Начальная цена: 66 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 6 650 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 325 000 бел. руб.** |
| **Лот №9.** Контейнер холодильник (инв. №1225). **Начальная цена: 17 200 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 1 720 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 860 000 бел. руб.** |
| **Лот №10.** Трактор Беларусь МТЗ-82.1, 1998 г. в., регистрационный знак 28-50 ВА. **Начальная цена: 70 100 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 7 010 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 505 000 бел. руб.** |
| **Лот №11.** Трактор Беларусь МТЗ 82, 1993 г. в., регистрационный знак БЯ 1781. **Начальная цена: 68 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 6 850 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 425 000 бел. руб.** |
| **Лот №12.** Грузовой специальный самосвал MAZ 555142, 2006 г. в., цвет белый, регистрационный знак АА 7686-2. **Начальная цена: 76 800 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 7 680 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 3 840 000 бел. руб.** |
| **Лот №13.** Грузовой специальный самосвал SAZ-3507, 1989 г. в., цвет голубой, регистрационный знак ВА 8751. **Начальная цена: 27 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 2 750 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 375 000 бел. руб.** |
| **Лот №14.** Грузовой бортовой GAZ–53А, 1981 г. в., цвет голубой, регистрационный знак АА 4591-2. **Начальная цена: 20 800 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 2 080 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 1 040 000 бел. руб.** |
| **Лот №15.** Грузовой фургон GAZ 3309 «Белава-02», 2011 г. в., цвет белый, регистрационный знак АЕ 5492-2. **Начальная цена: 107 400 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 10 740 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 5 370 000 бел. руб.** |
| **Лот №16.** Грузовой фургон MAZ 437043, 2011 г. в., цвет светло-серый, регистрационный знак АЕ 5312-2. **Начальная цена: 111 400 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 11 140 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 5 570 000 бел. руб.** |
| **Лот №17.** Трактор МТЗ-1221В, 2006 г. в., регистрационный знак ВА 7561. **Начальная цена: 178 500 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 17 850 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 8 925 000 бел. руб.** |
| **Лот №18.** Трактор Беларус 1221, 2006 г. в., регистрационный знак ВА-2 4682. **Начальная цена: 170 400 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 17 040 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 8 520 000 бел. руб.** |
| **Лот №19.** Трактор Беларус 320.4 без навесного оборудования, 2013 г. в., регистрационный знак ВВ-2 5708. **Начальная цена: 111 700 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 11 170 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 5 585 000 бел. руб.** |
| **Лот №20.** Трактор МТЗ 82.1. регистрационный знак 4683 ВА-2, 2006 г. в. **Начальная цена: 109 700 000 бел. руб. без учета НДС. Размер задатка: 10 970 000 бел. руб. Сумма шага аукциона – 5 485 000 бел. руб.** |
| Торги состоятся **19.10.2015 г. в 15.00** по адресу: Витебская область, г. Глубокое, ул. Ленина, 1 в ОАО «КУПЦОВЪ». Заявления на участие в торгах со всеми необходимыми документами принимаются в рабочие дни с 8.30 до 17.30 по адресу: г. Витебск, проезд Гоголя, 5 в ККУП «Витебский областной центр маркетинга». Срок внесения задатка и подачи заявлений на участие в торгах: **с 17.09.2015 с 8.30 по 16.10.2015 г. до 17.30.** |

Торги проводятся в соответствии с Законом Республики Беларусь от 13 июля 2012 г. № 415-З «Об экономической несостоятельности (банкротстве)». Лица, желающие участвовать в торгах, обязаны подать организатору торгов заявление на участие в торгах с приложением документов: заверенного банком документа, подтверждающего внесение суммы задатка на текущий (расчетный) банковский счет, указанный в извещении; для индивидуального предпринимателя – копии свидетельства о гос. регистрации индивидуального предпринимателя; для юр. лица – доверенности, выданной представителю юр. лица (кроме случаев, когда юр. лицо представляет его руководитель), а также копии свидетельства о гос. регистрации юр. лица; для иностранного юр. лица, иностранной организации, не являющейся юр. лицом, созданной в соответствии с законодательством иностранных государств иностранным государством и его административно-территориальными единицами в лице уполномоченных органов, международной организации – легализованных в установленном порядке копий учредительных документов, выписки из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иного эквивалентного доказательства статуса юр. лица в соответствии с законодательством страны происхождения, документа о финансовой состоятельности, выданного обслуживающим банком; для представителя гражданина РБ, в том числе индивидуального предпринимателя – доверенности, оформленной в соответствии с законодательством. При подаче документов на участие в торгах граждане РБ, иностранные граждане и лица без гражданства, а также граждане РБ, постоянно проживающие за пределами РБ, представители юр.лиц РБ, предъявляют паспорт или иной документ, удостоверяющий личность. Имущество считается проданным лицу, которое предложило на торгах самую высокую цену. В случае если торги признаны несостоявшимися, предмет торгов продается единственному участнику, подавшему заявление на участие в торгах (либо явившемуся для участия в них) при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5%. Победитель торгов в день проведения торгов подписывает протокол. Победитель торгов (претендент на покупку) обязан: в течение 5 (пяти) дней со для проведения торгов возместить затраты на организацию и проведение торгов, затраты по оценке имущества, изготовлению документации, необходимой для проведения торгов; в течение пяти рабочих дней со дня проведения торгов подписать договор купли-продажи; оплатить предмет торгов и НДС в размере 20% от цены продажи имущества в порядке и в сроки, установленные договором купли-продажи. Сумма задатка перечисляется на р/с 3012470630033 в РКЦ № 39 в г. Глубокое филиала ОАО «Белагропромбанк» – Витебское областное управление, код 424, УНП 300019596. Получатель платежа: ОАО «КУПЦОВЪ». Организатор торгов вправе отказаться от проведения торгов не позднее чем за 5 дней до даты их проведения. Ознакомление с объектом осуществляется в рабочие дни с 8.30 до 17.00. **Контактный тел. (0212) 42-61-62, (029) 510-07-63, e-mail: vcm74@mail.ru, marketvit.by.**

Центр Промышленной Оценки

- Организация аукционов
- Оценка всех видов имущества

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

| Организатор аукциона | **ЗАО «Центр промышленной оценки»,** г. Минск, ул. Мележа, 5/2, офис 1703 | | | |
|---|---|---|---|---|
| Продавец | **Открытое акционерное общество «Ремстрой», г. Пружаны, Брестская обл., г. Пружаны, ул. Промышленная, 3** | | | |
| Месторасположение предмета аукциона | **Брестская обл., Пружанский р-н, г. Пружаны, ул. Макаренко, 15А** | | | |
| **Наименование** | **Назначение** | **Общая площадь** | **Инвентарный номер** | **Адрес (№ дома)** |
| **Административное помещение – 1 этаж** | Административное помещение | 169,6 кв.м | 124/D-7641 | ул. Макаренко, 15А-1 |
| **Помещение складов №№1, 2** | Складское помещение | 138,4 кв.м | 124/D-7639 | ул. Макаренко, 15А/2-1 |
| **Складское помещение №4** | Складское помещение | 143,7 кв.м | 124/D-7619 | ул. Макаренко, 15А/2-2 |
| **Здание мастерской** | Здание специализированное мастерской | 401,9 кв.м | 124/С-4144 | ул. Макаренко, 15А/1 |
| Составные части и принадлежности: | навес | | | |
| **Гараж** | Здание специализированное автомобильного транспорта | 236,6 | 124/С-19592 | ул. Макаренко, 15А/3 |
| **В состав лота входят дворовые сооружения:** туалет, асфальтовое покрытие, ворота, забор металлический, плиточное покрытие, и **оборудование**: котел отопительный. | | | | |
| **Начальная цена с НДС 20% – 768 673 303 белорусских рубля (снижена на 50%).** | | | | |
| **Сведения о земельном участке**: | Для обслуживания зданий продавцу предоставлена доля в праве постоянного пользования (5188/10377) на земельный участок площадью **1,0377** га. | | | |
| **Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с № 3012343260010; нерезидентами РБ в валютном эквиваленте по курсу Нацбанка РБ на дату платежа на в/с: в долларах США (USD) – 3012343265044; в российских рублях (RUB) – 3012343265028; в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по г. Минску и Минской области, БИК 153001739, УНП 191021390, получатель платежа – ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | | |
| **Срок подписания договора купли-продажи:** | **15** рабочих дней после проведения аукциона. | | | |
| **Условия оплаты предмета аукциона** | | | | |
| Если между продавцом и покупателем (победитель аукциона либо единственный участник аукциона, согласившийся приобрести предмет аукциона по начальной цене, увеличенной на 5%) в течение срока, установленного для подписания договора купли-продажи, не достигнута договоренность по срокам и о порядке оплаты за предмет аукциона, такая оплата должна быть произведена в течение **30 (тридцати) календарных дней** после подписания договора купли-продажи. | | | | |
| Порядок проведения аукциона, оформления участия в аукционе, определения лица, выигравшего аукцион, а также возмещения затрат и оплаты вознаграждения за организацию аукциона, оговорен в Условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов **www.cpo.by.** | | | | |
| *Предыдущее извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 13.08.2015* | | | | |
| **Дата и время проведения аукциона** | **08.10.2015 в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | |
| **Дата и время окончания приема документов** | **06.10.2015 до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, офис 1703, ЗАО «Центр промышленной оценки».** | | | |
| **Контактные телефоны** | **Тел.: +375 17-280-36-37; +375 29-183-69-71. E-mail: auction@cpo.by** | | | |

## ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОТКРЫТОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ОБЪЕКТОВ НЕДВИЖИМОСТИ В ПИНСКОМ РАЙОНЕ

| | |
|---|---|
| **Наименование объекта** | Капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44176 «Коровник с молочным блоком», капитальное строение с инвентарным номером 130/С-44177 «Дом животновода» |
| **Местонахождение объекта** | 225734, Республика Беларусь, Брестская область, Пинский район, Загородский с/с, 2, 2/1, юго-восточнее деревни Вяз |
| **Продавец объекта** | ОАО «Новодворское-агро» |
| **Тип помещения** | Отдельно стоящие |
| **Общая площадь (кв.м)** | 1722,7 $м^2$, 47,6 $м^2$ |
| **Начальная цена (рублей)** | 704 030 000 |
| **Сумма задатка (рублей)** | 35 201 500 |
| **Характеристика объекта, площадь земельного участка (кв.м), решение об отводе земельного участка** | «Коровник с молочным блоком» – здание специализированное животноводства, «дом животновода» – здание специализированное иного назначения, расположенные на земельном участке с кадастровым номером 125483700001000026 общей площадью 4,5467 га |
| **Организатор аукциона** | ОАО «Новодворское-агро», УНН 290481563 225735, Брестская обл., Пинский район, д. Чухово, ул. Полесская, 1а, т./факс (0165) 39-81-10, мтс 80333991260 |

**Аукцион состоится 28 сентября 2015 года в 10.00 по адресу: 225735, Брестская обл., Пинский район, д. Чухово, ул. Полесская, 1а.**

Прием документов, а также консультации по вопросам участия в торгах осуществляются **с 16 сентября 2015 года по 25 августа 2015 г. включительно по рабочим дням с 9.00 до 12.00.**

*Дополнительная информация опубликована в газете «ЗВЯЗДА» №145 от 01.08.2015, № 172 от 04.09.2015.* УНН 290481563

## ИЗМЕНЕНИЯ В ПРОЕКТНОЙ ДЕКЛАРАЦИИ ИООО «Датч Стар»,

**опубликованной в газете «Звязда» 26.09.2013 г. № 181, строительства многоквартирного жилого дома с подземной гараж-стоянкой (№ 1 по генеральному плану в квартале пр. Дзержинского – ул. Щорса – ул. Железнодорожная – ул. Хмелевского) со встроенными объектами обслуживания населения:**

«...Стоимость 1 кв.м для граждан, не нуждающихся в улучшении жилищных условий, квартиры площадью **40,68 кв.м** на 14 этаже, общей площадью **89,84 кв.м** на 11 этаже, общей площадью **89,87 кв.м** на 14 этаже – 1300 (одна тысяча триста) долларов США; общей площадью **40,68 кв.м** на 4, 17 этажах, общей площадью **90,12 кв.м** на 17 этаже – 1200 (одна тысяча двести) долларов США».

**Дополнительную информацию можно получить по адресу: г. Минск, ул. Немига, 40, офис 704.**

**Тел. 8 (017) 306 20 90, Vel.: 8 (029) 380 26 80, 8 (044) 781 81 17.**

УНП 191061436

■ Без абмежаванняў

# ЗВЫЧАЙНЫЯ СЕМ'І З АСАБЛІВЫМІ ПАТРЭБАМІ

**Напэўна, самае страшнае — застацца са сваёй праблемай сам-насам. Не сустрэць паразумення, не знайсці падтрымкі. Сем'і, у якіх выхоўваюцца дзеці-інваліды, з гэтым часта сутыкаюцца. Многіх ахоплівае адчай. Бо стамляюцца, бо хочуць даць дзецям самае лепшае, а астатнія чамусьці баяцца ўпусціць іх у штодзённае жыццё. Але можа быць інакш. Некалькі гісторый пра тое, што на валанцёрскія праекты можна знайсці грошы, а спецыялізаваныя ўстановы для інвалідаў — не адзіны варыянт.**



Эйман Тай упэўнены, што за валанцёрствам — будучыня.

## ГІСТОРЫЯ 1.
### «Вашы мамы для мяне гераіні»

Эйман ТАЙ жыве ў маленькім гарадку ў Ірландыі. Зарабляе на жыццё тым, што робіць рамы для карцін. Але не гэта галоўнае. Эйман — валанцёр дабрачыннага фонду Chernobyl Children's Trust. Дзякуючы гэтай арганізацыі дзеці, якія жывуць на забруджаных ад радыяцыі тэрыторыях (пераважна з Гомельшчыны), прыязджаюць на лета ў госці да ірландскіх сем'яў. Штогод такой магчымасцю могуць скарыстацца каля 150 малых. Акрамя таго, улетку валанцёры з Ірландыі прыязджаюць у наш санаторый «Надзея», што ў Вілейскім раёне, дзе арганізуюць двухтыднёвую змену для інвалідаў і іх сем'яў. «Надзея» выбрана не выпадкова: карпусы і гульнявая пляцоўка лагера прыстасаваны для інвалідаў.

Разам з валанцёрамі часам прыязджаюць медсёстры і фізіятэрапеўты. Яны расказваюць, як карміць дзіця, як рабіць масаж, каб той даў большы эфект. Вучаць нават перасаджваць малых з інваліднага крэсла на канапу. Здавалася б, дробязь, але многія мамы прызнаюцца, што «сарвалі» сабе спіну і рукі, бо не ведалі, як пераносіць дзяцей правільна. Для жанчын, дарэчы, гэтая змена ў санаторыі не менш важная. Пакуль валанцёры гуляюць з малымі і клапоцяцца пра іх, мамы могуць перавесці дух. Чалавечыя ж сілы абмежаваныя: бацькам патрэбна хоць некалькі дзён, каб адпачыць.

— Гэтыя беларускія мамы для мяне гераіні, — кажа Эйман. — Яны так шмат цягнуць на сабе!..

Цягнуць даводзіцца ў прамым сэнсе слова. Бо беларускі асяродак цалкам безбар'ерным пакуль не стаў. «Летась мы хадзілі ў мінскі цырк, — узгадвае Эйман. — Прыгожы будынак. Але, калі ты інвалід, трапіць туды без старонняй дапамогі амаль немагчыма. Ёсць спецыяльны ліфт, але, каб ім скарыстацца, трэба неяк выбрацца з каляскі, узняцца па прыступках і знайсці жанчыну, у якой ёсць ключы ад ліфта. Ірландыя ў гэтым плане таксама не ідэальная. Столькі ўжо пабудавалі, але нашы архітэктары дагэтуль часам забываюць стварыць умовы для інвалідаў».

Ірландская сістэма сацыяльнай падтрымкі разлічана на тое, каб інваліды маглі жыць самастойна. Яны атрымліваюць грашовую дапамогу: сумы не надта вялікія, але дастатковыя, каб не залежаць ад сваякоў. Вядомую нам паслугу сацыяльнага работніка развілі яшчэ далей. Людзям з асаблівасцямі прапануюць жыць у дамах па тры-чатыры чалавекі, і дзяржава выдзяляе на гэтую групу памочніка, які прыходзіць да іх на ўвесь дзень. А дзеці-інваліды наведваюць звычайную школу. Спадар Тай расказвае, што за кожным такім вучнем замацоўваюць т'ютара — дадатковага настаўніка, які суправаджае малога на ўроках і дапамагае яму (напрыклад, трымаць ручку):

— У класе з маёй дачкой — двое хлопцаў на калясках. Але калі вы спытаеце ў яе: «Што не так з Майклам (так завуць аднаго з тых юнакоў)?», яна будзе здзіўлена: «Нічога, з ім усё нармальна». Дзеці з маленства бачаць інвалідаў на вуліцах, вучацца з імі ў адным класе і таму ўспрымаюць іх як звычайных людзей.

Гэтая сістэма сацыяльнай падтрымкі выпрацоўвалася ў Ірландыі каля 25 гадоў. Тое, што да інвалідаў там ставяцца па-іншаму, адчуваецца нават у словах. Выраз «чалавек з абмежаванымі магчымасцямі» вы рэдка пачуеце. Дзяцей-інвалідаў еўрапейцы называюць асаблівымі ці «з асаблівымі патрэбамі». Добрая фармуліроўка, ці праўда?

Для Эймана, дома ў якога сёлета гасцююць чатыры маленькія беларусы, валанцёрства — ужо частка жыцця. «Гэта наша культура. Прыемна разумець, што за дзень ты зрабіў штосьці карыснае».

## ГІСТОРЫЯ 2.
### «Хачу аддзячыць за дапамогу...»

Мікіта НЕВЯРОВІЧ вучыцца на хімфаку БДУ. Раней ён ездзіў на лета ў госці да ірландскіх сем'яў, цяпер жа далучыўся да дабрачыннага фонду ў якасці валанцёра і перакладчыка. «Хачу аддзячыць за тую дапамогу, што я некалі атрымаў», — кажа юнак.

Валанцёрская місія Мікіты не абмяжоўваецца двума тыднямі. Разам са сваёй жонкай, ірландкай Марыяй, яны стараюцца падтрымліваць сем'і з інвалідамі на працягу ўсяго года. І заахвочваюць да гэтага іншых. Каля 20 знаёмых Марыі і Мікіты цяпер раз на тыдзень наведваюць людзей, якім неабходна падтрымка.

— Беларуская моладзь актыўна далучаецца да валанцёрства, — заўважае хлопец. — Але праблема, якую я бачу, — гэта тое, што людзі разава выязджаюць на нейкія праекты і мерапрыемствы. Няма пастаянства. Павінна быць структура (і мы з Марыяй зараз спрабуем стварыць яе), якая мае сувязі і фінансы, хаця б мінімальныя, каб нават той транспарт арганізаваць.

Валанцёры, вядома, працуюць бясплатна, але праекты патрабуюць сродкаў. Так, кожны з ірландскіх валанцёраў збірае грошы, каб прыехаць у Беларусь самому і прывезці ў санаторый адну сям'ю. Можна шукаць і іншыя шляхі фінансавання. Сёлета, напрыклад, на арганізацыю двухтыднёвага адпачынку для інвалідаў Марыя атрымала грант. Даслала апісанне праекта ў еўрапейскую праграму «Эразмус +», там яго ўхвалілі і выдаткавалі грошы. 45 тысяч еўра. А суму, якую сабралі валанцёры, цяпер можна пусціць на іншыя патрэбы гомельскіх сем'яў з асаблівымі дзецьмі.



У санаторыі «Надзея» Мікіта Невяровіч (справа) дапамагае інвалідам і замежным валанцёрам зразумець адзін аднаго.



У Алены і Арсенія ёсць падтрымка — вялікая сям'я.

## ГІСТОРЫЯ 3.
### «Хоць сын не хадзіў, абувала яго ў артапедычныя сандалі»

Алена некалі працавала ў гомельскім доме дзіцяці. Дваццаць гадоў клапацілася пра чужых малых. Але потым была вымушана звольніцца: пастаянны догляд спатрэбіўся яе сыну. Інваліднасць маленькага Арсенія для Алены стала нечаканасцю. На той момант яна ўжо была мамай чацвярых здаровых дзяцей. А тут — родавая траўма. І, як вынік, ДЦП.

Вопыт, назапашаны ў доме дзіцяці, аказаўся дарэчы. Жанчына хацела дапамагчы свайму сыну настолькі, наколькі гэта магчыма, і ведала, што для гэтага трэба рабіць. Калі хлопчык быў зусім маленькім, Алена ўкладвала яго спаць у воўну: гэта паляпшала кровазварот у нагах. Пастаянна рабіла сыну масаж шчок і дзёсен, каб зубы раслі роўнымі. І, хоць хлопчык не хадзіў, з дзяцінства абувала яго ў артапедычныя сандалі і чаравічкі, у якіх ступня фарміруецца правільна.

— Я ўсё гэта ведала, бо займалася з дзецьмі з ДЦП, — кажа Алена. — Аднак многія мамы сутыкаюцца з такой праблемай упершыню. Добра было б, каб у кожнай паліклініцы зрабілі спецыяльны кабінет, дзе жанчыны, у якіх дзеці-інваліды, маглі б пракансультавацца, як даглядаць гэтых малых.

Тое, што падобныя кабінеты сёння неабходны, Алена не сумняваецца. «Калі я пачынала працаваць у доме дзіцяці, у нас было адно аддзяленне з хворымі малымі. Калі сыходзіла, засталося толькі адно аддзяленне са здаровымі».

Маме дзевяцігадовага Арсенія пашчасціла мець вялікую сям'ю (хлопчык, дарэчы, не самы малодшы, Алена нарадзіла яшчэ адно дзіця, шостае). У яе ёсць падтрымка. Але ведаеце, у чым гэтая мама з вопытам прызналася? «Калі жанчына нараджае такое дзіця, яна адчувае сябе непаўнавартаснай, вінаватай». Мамы знаходзяцца пад псіхалагічным ціскам ужо ад самага пачатку. Праўда, праблема не ў іх, а ў грамадстве, якое па-ранейшаму называе людзей з інваліднасцю абмежаванымі. Дзіўна, але знайсці тысячы еўра аказваецца прасцей, чым прымусіць навакольных перагледзець стэрэатыпы і прызнаць, што малыя з ДЦП — таксама дзеці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*
**Фота аўтара і з архіва валанцёраў**

■ Вазьму твой боль...

# Бог усім роўна дзеліць




**Я ўдзячна Богу за ўсіх людзей, якіх сустракаю ў сваім жыцці. І асабліва — за каманду «Клуба 5000». Ніхто з нас не ёсць цэлая і ўкамплектаваная адзінка, ніхто з нас не ідэальная асоба. Але кожны з нас — кавалачак вялікага пазла. І калі кавалачкі злучаюцца, дапаўняюць адзін аднаго, ты становішся сведкам цуду — з хаатычнага набору маленькіх фрагментаў нараджаецца суцэльная карцінка.**

У валанцёрскай рабоце мы час ад часу сутыкаемся з канфліктнымі сітуацыямі. І нікому не хочацца акунацца ў іх, але камусьці трэба разрульваць. Я бяру на сябе перамовы, а Крысціне даручаю разведаць абстаноўку, здабыць інфармацыю, праверыць факты. Цішком грызу сябе за такое размеркаванне роляў: менш за ўсё мне хацелася б высвятляць дэталі канфлікту, і я несумленна скідваю гэта на калегу.

Праз некалькі дзён сітуацыя наладжваецца, а мае ўнутраныя згрызоты не сцішваюцца. Пішу электроннае пасланне Крысціне з падзякай, што зрабіла гэтую нялёгкую справу, шчыра прызнаю, што яна малайчына і я так не справілася б. Націскаю кнопку, каб адправіць паведамленне, і ў тую ж секунду атрымліваю ліст ад Крысціны — з падзякай, што дапамагла ёй вырашыць канфлікт і ўзяла на сябе перамовы — ёй гэта даецца складаней.

Аказваецца, інтуітыўна кожная з нас выбрала тое, што ёй лягчэй зрабіць, што бліжэй натуры, што даецца з меншымі затратамі. Бо мы розныя. Тое, чаго не хапае мне, з лёгкасцю змясцілася ў яе характары. А мае здольнасці арганічна дапаўняюць яе ўменні. Мы два суседнія фрагменты, якія свабодна злучаюцца і ўтвараюць выразную выяву.

Гасподзь не стварыў з нас аднаго ідэальнага чалавека, які адначасова віртуозна здабывае інфармацыю і з лёгкай душой размаўляе на непрыемныя тэмы. Ён надзяліў кожную нечым адным. Ідэальных людзей увогуле не бывае.

Выдатны спявак з бездакорным музыкальным слыхам, салодкім голасам і талентам да напісання песень. Я слухаю яго запісы, а па спіне бягуць дрыжыкі. А прыходзіш на яго канцэрт у прадчуванні чаканай сустрэчы, а на справе — зноў слухаеш запісаны дыск. Няма экспрэсіі, няма падачы, няма энергетыкі. Усё, што ён мае, — салодкі голас і ідэальны музыкальны слых.

А іншы і ноту няправільна возьме, і музыка ў яго — нічога асаблівага, і словы немудрагелістыя, ды так умее падаць, зарадзіць энергіяй! Так натхняе, што ну іх, гэтыя ідэальныя ноты! Дасканалых людзей няма.

Я ведаю прыгожую дзяўчыну, ад якой вачэй не адарваць. І стан, і твар, і стыль, і вопратка — няўжо бывае так, што ўсё адной дадзена? Але варта ёй загаварыць — непрыемны голас, невыразнае вымаўленне — шарм губляецца ў імгненне.

А бывае наадварот: знаёмішся з чалавекам па тэлефоне і ўлюбляешся ў адзін толькі голас. Сустрэнеш і не паверыш: няўжо з такім тэмбрам спалучаецца такі нязграбны нос? Дык не бывае так, каб усё і адразу. Бог пароўну дзеліць.

Мая сяброўка Наташа — майстар у сваёй прафесіі. Яна апантаная работай. Дзень і ноч гатова на ёй бавіць. Ды што там гатова — так і ёсць, суткамі занятая. І атрымліваецца ж у яе! Вынік цудоўны. І грошы зарабляе добрыя: у сям'ю ўкладае, кватэру набыла, адпачынак аплаціла. Я толькі назіраю і ўздыхаю: не ўмею так. Але варта ёй зайсці да мяне ў госці, кампліменты і белая зайздрасць сыплюцца ўжо ў мой адрас. «Ты так смачна гатуеш, — кажа сяброўка, — я ніколі не стаяла б столькі ля пліты. Прасцей гатовае набыць ці перакусіць усухамятку». Вось так мы падзялілі таленты: каму грошы зарабляць, каму есці гатаваць.

Сяброўка Каліна пазнаёміла са сваім кавалерам. Ну такі выдатны, што не падкапаешся. І разумны, і клапатлівы, і стрыманы, і ветлівы. Растапіў маё сяброўскае сэрца сваімі адносінамі да дзяўчыны. Так і быць, прымаем да сваіх і аддаём яму Каліну. Няўжо ідэальны? Не. Пры ўсёй сваёй дабрыні і спагадлівасці ён жыве на дзве краіны і... на дзве сям'і. Пра кожную клапоціцца, кожную дагледзіць і забяспечвае. Пры гэтым падманвае абедзве і спакойна спалучае гэта са сваёй выхаванасцю і інтэлігентнасцю.

Мы далёкія ад ідэалу кавалачкі дасканалай карцінкі. Але не маем права зайздросціць іншым. Бо ім не хапае таго, што ёсць у нас. Бог усім пароўну даў. І толькі разам — мы сіла. Толькі разам мы можам многае!

**Таццяна НЕМЧАНІНАВА, заснавальніца дабрачыннага руху «Клуб 5000»**
■

■ Майстар-клас

# «ПЯКУЧАЕ» АДЗЕННЕ,

## або Чай, што расце пад нагамі



**Карэспандэнт «Сямейнай газеты» паспрабаваў зрабіць з крапівы карысны для здароўя сувенір, а таксама збіраць, апрацоўваць і заварваць скрыпень. Гэтаму яго навучылі жанчыны з вёскі Гара Віцебскага раёна, якія жывуць у гармоніі з прыродай, вырошчваюць экалагічна чыстую прадукцыю і адраджаюць традыцыі продкаў.**

### КРАПІЎНАЯ МЕДЫТАЦЫЯ

— Ва ўсім свеце расце каля 50 відаў крапівы. У нас найбольш распаўсюджаныя пякучая і двухдомная. Апошняя — лекавая. Лепш за ўсё пачынаць збіраць крапіву ў сухое надвор'е ў другой палове дня. І не варта «накідвацца» на яе пры зборы. Трэба «наладзіць з ёй дыялог», як з жывой істотай. Зразумейце, што яна, калючая, людзям на карысць... Дарэчы, у крапівы ёсць сваё свята: 26 чэрвеня — «крапіўны Спас». Збіраць яе можна... да канца снежня. Не здзіўляйцеся, расліна нават у вялікія маразы пад снегам захоўвае свае карысныя якасці. Неяк знаёмыя расказалі пра тое, што можна рабіць з крапівы. Вось я і пачала шукаць інфармацыю ў кнігах, інтэрнэце. Метадам спроб і памылак шмат чаму навучылася, — распавядае Кацярына Кухто, якая і правяла для мяне «крапіўны» майстар-клас. — Зараз будзем з вамі вучыцца «здабываць» крапіўнае валакно са сцябла.

Спачатку мы білі сцябло драўляным малатком, пакрысе надломвалі. Потым трэба было акуратна размяць «скуру», ці, іншымі словамі, «патрапаць». А яшчэ цэрлі ўжо апрацаваную крапіву, каб дастаць валакно...

— А калі шмат трэба апрацаваць крапівы, выкарыстоўваецца вось такі «апарат» — мяліца (церніца). А яшчэ лепш прымяняць мялкі. Ды не хвалюйцеся вы так. Атрымлівайце асалоду ад працэсу.

Дарэчы, многія адзначалі, што апрацоўка крапівы нагадвае сеанс медытацыі. І нават калі стамляліся, праз некалькі гадзін атрымлівалі вельмі добры станоўчы зарад энергіі, — вучыць мяне майстрыха.

Урэшце я здолеў зрабіць кароткую нітачку-абярэг, якую Кацярына завязала мне на руку. «Крапіўніца» сказала, што такі «сувенір» абараняе ад сурокаў, надае ўпэўненасці ў натоўпе...

— У мяне таксама ўсё пачыналася з такой нітачкі. Зрабіла, кулон павесіла на яе і хадзіла. Эфект выдатны. Цікавая ўласцівасць яшчэ ў крапівы — спрыяе гарманізацыі. Простай мовай — становішся дабрэйшым літаральна праз дзень-два. На сабе правярала: калі негатыўныя і стрэсавыя сітуацыі, спакойна рэагуеш, — прызналася яна.

Маладая крапіва выкарыстоўваецца ў салатах і супах, з сушанай заварваецца гарбатка. У ёй шмат вітаміну С, арганічных кіслот, кераціну. Лекавая крапіва дапамагае пры страўнікава-кішачных захворваннях. Свежай раслінай карысна... караць дзяцей ды і дарослых. Гэта агульнаўмацавальная, лячэбная і прафілактычная працэдура. Крапіва валодае антысептычным, антыгрыбковым уздзеяннем.

Чахол для мабільніка з «пякучкі» гарантуе мінімальнае негатыўнае ўздзеянне на чалавека. Вусцілкі прыдадуць адчуванне лёгкасці нават падчас доўгіх паходаў. З расліны робяць і зубны парашок, шампунь, мыла, венікі для лазні. Можна з яе таксама вязаць шкарпэткі, шыць кашулі, нават валёнкі рабіць. Што тычыцца кошту такіх вырабаў... Кацярына ў Маскве бачыла крапіўную кашулю за 1000 долараў. Зразумела, у нас такое наўрад ці купіць чалавек з сярэднім дастаткам. Мая «настаўніца» заверыла, што эксклюзіўныя рэчы ўласнай вытворчасці будзе ацэньваць па як мага больш прывабнай цане. Хаця, як вы самі зразумелі, трэба папацець, каб толькі валакно здабыць...



Кацярына Кухто вучыць журналіста.

**Цікавыя факты пра крапіву**

✓ **Адзенне з крапівы людзі робяць ужо больш за 6 тысяч гадоў.**

✓ **Крапіўная пража мякчэйшая, чым льняная. У спёку ў крапіўным адзенні адчуваеш сябе камфортна, а ўзімку ў ім цяплей.**

✓ **У форме напалеонаўскіх і іншых армій былі і крапіўныя атрыбуты.**

✓ **Калі італьянскі дом моды прадставіў крапіўную калекцыю адзення — джынсы і курткі — поспех быў фантастычным.**

✓ **Падвойная крапіўная нітка вытрымлівае да 9 кілаграмаў статычнай нагрузкі.**

✓ **У казцы Андэрсена крапіўныя кашулі-кальчугі вярнулі братам-лебедзям чалавечае аблічча.**

✓ **Штогод у вёсцы Крапіўна, дзе знаходзіцца сядзіба Льва Талстога, праводзіцца міжнародны фестываль крапівы. Апошняя — афіцыйны сімвал былога горада. Яе галінкі намаляваны на гербе, зацверджаным у 1778 годзе.**

### ЭХ, СКРЫПНЕМ!

— Скрыпень пілі нашы продкі, пакуль не з'явіліся замежныя канкурэнты. А калі задумацца, пагадзіцеся, навошта нам кітайскія ды індыйскія чаі? Калі свой расце пад нагамі! Дарэчы, скрыпень калісьці экспартаваўся. Паколькі еўрапейцы называлі жыхароў Расійскай імперыі Іванамі, адтуль і руская назва гэтай цудоўнай гарбаты — іван-чай, — раскрыла таямніцы Алёна Хлапцова, з якой мы і пайшлі збіраць скрыпень.

Гэтая расліна з кветкамі фіялетава-ружовага колеру любіць месцы, дзе раней былі будынкі, на ярах. Дарэчы, многія думаюць, што трэба збіраць кветкі. А насамрэч — лісцікі!

— Калі бачым, што кветкі толькі пачынаюць распускацца, можна пачынаць збор. Трымаем сцябло і лёгка абдзіраем лісцікі. Затым іх трэба падвяліць гадзіну-дзве. І не на сонцы, а ў цені. Бо ад сонца яны страцяць усе карысныя рэчывы. Пасля гэтага пачынаем ферментаваць. Ёсць два варыянты. Кладзяце лісце ў керамічную пасудзіну вялікай ёмістасці і прыкладна 40 хвілін іх камечыце. Пакуль сок не пачне выдзяляцца. Другі — «жаночы» варыянт: круціць лісце праз мясарубку. Ёмістасць шчыльна закрываем, каб не было доступу паветра. У выніку атрымліваецца, што расліна «стаіць у сваім соку». На працягу ад 1 да 3 сутак адбываецца ферментацыя. І пры гэтым абавязкова (!) трэба ўлавіць момант, каб працэс не перайшоў у стан закісання прадукту. Гэта значыць, ад яго не павінен ісці кіслы пах. Я спачатку пару разоў прапусціла той момант, і прадукт быў сапсаваны. Так, трэба ўсё рабіць інтуітыўна. Але ў першую чаргу арыентавацца па паху. Павінен быць фруктовы водар, — тлумачыць нюансы мая настаўніца. — Вы што, нельга заліваць гарбату кіпенем! — здзіўляецца, што я не ўмею запарваць гарбату, Алена. — Выключна халоднай вадой. І награваць да прыкладна 50 градусаў. Як вызначыць? Трэба дакрануцца да чайніка. Калі яшчэ можаце трымаць руку, тады рана выключаць агонь. А калі горача, смела выключайце і пакіньце хвілін на 10 або 15. Толькі тады трава і аддасць усе свае карысныя рэчывы,

Скрыпень практычна не мае супрацьпаказанняў. Піць можна нават немаўлятам. Ён нармалізуе сон, добра здымае галаўны боль. Карысны для падтрымання імунітэту, для прафілактыкі герпесу. Надае сіл, пры гэтым супакойвае. Яго раяць піць пры захворваннях крыві, атручэннях, эпілепсіі...

На сезон сям'і з трох чалавек хопіць трохлітровага слоіка ферментаванай гарбаты. У Гары за 50 грамаў просяць 50 тысяч рублёў.

На развітанне суразмоўца пачаставала незвычайным кактэйлем. У скрыпень і іншыя зёлкі трэба ўліць крыху вады. Потым узбіць міксерам да густога стану. Пасля гэтага дадаць мёду або розных ягад, можна банан. У выніку атрымліваецца смаката. Можна дасягнуць кансістэнцыя ёгурту, калі больш дабавіць вады — кактэйлю.

**P.S.** *Дарэчы, крапіўная нітачка зрабіла маленькі цуд: аблегчыла боль падчас абвастрэння захворвання.*

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**
*pukshanski@zviazda.by*
*Віцебскі раён — Віцебск*

**Цікавыя факты пра скрыпень**

✓ **Да рэвалюцыі ў Англію «іван-чай» пастаўлялі легальна. А ў Францыю і Германію, дзе клапаціліся за манаполію, яго прывозілі кантрабандысты.**

✓ **Скрыпень яшчэ называюць капорскім чаем у гонар назвы вёскі пад Санкт-Пецярбургам. Гісторык Аляксандр Сярогін пісаў, што фашысты ў час Вялікай Айчыннай літаральна знеслі гэты населены пункт. Знішчылі палі са скрыпенем, разбурылі ўсе лабараторыі. Забілі ўсіх, хто займаўся ім. А ўсё таму, што скрыпень пастаўляўся чырвонаармейцам.**

✓ **Гарбата не змяшчае кафеіну — «легальнага віду наркотыку».**

✓ **У ёй амаль 2/3 элементаў табліцы Мендзялеева.**

✓ **Знахары прымяняюць скрыпень як сродак для прафілактыкі і лячэння алкагалізму.**

■ Мама, пачытай!

# ЛЯСНАЯ ПРЫГАЖУНЯ

У лесе, на палянцы, расла ялінка. Яна была стройная і прыгожая. Да яе прыбягалі пагуляць вавёрачкі і зайчаняткі. Прыляталі на яе пушыстыя галінкі птушачкі. І дрэўца было рада бачыць зверанят. І толькі маленькае Ваўчаня прыбегла да елачкі, паглядзела і сказала: «Якая ты калючая! І чаго гэта ў цябе замест лісця растуць іголкі? Паглядзі на дрэвы — яны прыгожыя! Увесну на іх растуць зялёныя лісточкі, а ўвосень яны мяняюць колер на жоўты і чырвоны. Потым лісце ападае і ніколі нікога не коле. А на цябе, ялінка, сумна глядзець — бо ты заўсёды аднаго і таго ж зялёнага колеру, ды яшчэ і калючая. І як толькі з табой гуляюць гэтыя дурныя зайчаняткі?»

Засумавала елачка і не ведала, што адказаць Ваўчаняці.

— Ай-яй-яй, — пачула чыйсьці голас Ваўчаня.

— Ваўчаня, так нельга! — сказала Вавёрачка. — Хіба ты не ведаеш, што ялінку называюць ляснойпрыгажуняй, таму што яе іголачкі зімой і летам зялёнага колеру?

Менавіта на яе галінкі кожны Новы год усе звяры нашага лесу вешаюць яркія цацкі і водзяць вакол яе карагоды.

Ваўчаня разгубілася і нічога не адказала.

І вось прыйшла зіма. Увесь лес пакрыўся белым пухкім снегам. Усе жыхары лесу рыхтаваліся да Новага года. Толькі Ваўчаня было не рада зіме. Бо ўсе ведалі, як яно пакрыўдзіла ялінку, і ніхто не хацеў з ім сябраваць.

А звераняты сталі ўпрыгожваць ялінку. Зайчаняты прынеслі моркву, вавёрачкі павесілі шышкі і арэхі. Снегіры прыляцелі з рабінай. Праз некаторы час ёлачка была ўжо такой прыгожай, што ўсім зверанятам стала вельмі весела. Яны спявалі песенькі і вадзілі карагоды.

Але раптам на палянку выйшла Ваўчаня і сказала:

— Прабачце мне. Я больш так не буду. Можна мне з вамі сустрэць Новы год? — І працягнула ў сваіх лапках прыгожую яркую зорачку.

— Гэта я для нашай ялінкі прынёс. Бо яна лясная прыгажуня! І няхай яна заўсёды ўпрыгожвае наш лес!

Тады Вавёрачка ўзяла зорачку і павесіла яе на верхавіну ялінкі.

— Прабачым яму, — сказаў маленькі Зайчык і павёў Ваўчаня ў карагод.

І зноў звераняты сталі весяліцца. Так у лесе і сустрэлі Новы год!

**Сям'я МАРКЕВІЧАЎ.**
*Свіслацкі раён*

*Людзі кажуць: «НЕ ВЫХОЎВАЙЦЕ ДЗЯЦЕЙ, УСЁ РОЎНА ЯНЫ БУДУЦЬ ПАДОБНЫЯ ДА ВАС. ВЫХОЎВАЙЦЕ СЯБЕ».*

**Адказная за выпуск Надзея ДРЫЛА.**

# ВЫХАД НА ПРЫРОДУ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Руды весяльчак Грыша — са старанных. Тут ён не ўпершыню. Кажа, што падабаецца раз на месяц прыходзіць у батанічны сад. Заўтра збіраецца на возера папрасіцца, чысціць вадаём ад апалых лістоў. На ўліку як беспрацоўны мужчына стаіць з мая.

— Не можаце знайсці добрую вакансію?

— Мне не патрэбна праца, — спакойна заяўляе Грыша. — Але я адказны грамадзянін, не хачу лічыцца дармаедам, таму выходжу на грамадскія работы. Так, у службе занятасці прапаноўваюць вакансіі, але наймальнікі мне стабільна адмаўляюць. Чаму? Ды розныя прычыны. Вопыту няма.

— А жыць на што?

— Грамадскія работы крыху зарабіць дапамагаюць...

— Дык гэта ж маленькая сума!

— А мне шмат і не трэба. Чым менш ты прывязаны да матэрыяльнага свету, тым больш незалежным і самадастатковым будзеш. Большасць хоча кар'еру, грошы, машыну, дом. І што, гэта і ёсць усё жыццё? Сумна.

Відаць, падумаўшы, што ён нас яшчэ не дастаткова здзівіў, Грыша пачаў расказваць, як харчуецца сонечнай энергіяй і займаецца алхіміяй. І я нават не ўпэўнена, што ён жартаваў. У любым выпадку, у батанічным садзе мужчына працуе сумленна.



Грыша ходзіць на работы ў батанічны з задавальненнем. «Можа, тады ўладкуецеся сюды?» — прапаноўваю. «Добры варыянт», — згаджаецца мужчына.

Заўважыўшы, як мы гутарым з Грышам, адзін са штрафнікоў (як ён сам сябе назваў), у адзенні і з тварам не першай свежасці, вырашыў паскардзіцца. «Працы няма, дык тут капаем. Дапамогу нам не плацяць!» — выказаўся мужчына і пайшоў да свайго не менш пакамечанага таварыша. Міхаіл Мікалаевіч, які гэта пачуў, абурыўся. «Я б такіх грамадзян асобна сяліў, на натуральную гаспадарку пераводзіў, каб яны самі ежу здабывалі. Адна справа, калі, як Грыша, не могуць вызначыцца, чым ім заняцца, шукаюць сябе. А гэтыя ж выпівохі цягнуць грошы з бацькоў. Ці крадуць«.

## НЕ ВЫТРЫМАЛІ КАНКУРЭНЦЫЮ

Пад дрэвамі, у навушніках, ціха перакопвае зямлю малады хлопец Дзяніс. Былога зборшчыка трансфарматараў звольнілі з электратэхнічнага завода па артыкуле за прагул. Зараз, кажа Дзяніс, знайсці працу праблематычна:

— У службе занятасці прапаноўваюць вакансіі падсобнага рабочага, грузчыка. Але ў большасці выпадкаў аказваецца, што гэтыя месцы ўжо заняты. На сваё прадпрыемства вяртацца пакуль не хочацца: былі там пэўныя непаразуменні.

Дзяніс, як высветлілася, спецыяльнасці не мае. Дый працу малады чалавек актыўна, відаць, не шукаў. «Заводаў шмат у Беларусі, уладкавацца, думаю, не праблема. Так, трэба будзе заняцца гэтым пытаннем».

Мы пакідаем беспрацоўных сам-насам з лапатамі і каранямі і ідзём любавацца садам. Пад нагамі лопаюцца зялёныя плады маньчжурскага арэха (вы ведалі, што яны пахнуць ёдам?). Памочнікаў, якія сёння прыбіраюць гэтую алею ад апалага лісця, таксама даслала ўпраўленне занятасці. «Бачыце таго мужчыну? Творчы чалавек. Гадзіну можа з адным лістком поркацца», — усміхаецца Міхаіл Мікалаевіч.



Дзяніс мяркуе, што працаўладкавацца ў сталіцы не праблема. Але сам пакуль вакансію не знайшоў.

Фота Надзеі БУЖАН.

«Творчы чалавек« на самай справе — электрык Дзіма. Праўда, рамантаваць разеткі мужчына больш не хоча. Спрабуе сябе ў IT-сферы. Вопыт быццам бы крыху ёсць. Але на месцы сістэмнага адміністратара і тэсціроўшчыка, якія параіла служба занятасці, мужчыну не ўзялі. Па словах Дзімы, на рынку працы сярод суіскальнікаў зараз жорсткая канкурэнцыя. І былы электрык пакуль прайграе астатнім прэтэндэнтам на прывабныя месцы.

Можна доўга скардзіцца на вялікую канкурэнцыю і маленькую дапамогу па беспрацоўі. (На апошнюю, дарэчы, шмат нараканняў: маўляў, вось у Еўропе выплаты дык выплаты, на іх пражыць рэальна. Рэальна, і беспрацоўныя гэтым карыстаюцца. Вырастаюць цэлыя «дынастыі», кожнае пакаленне якіх не лічыць патрэбным зарабляць самому, бо дзяржава і так забяспечвае.) А можна адправіцца на перанавучанне і павысіць свой прафесійны ўзровень ці атрымаць больш запатрабаваную спецыяльнасць (сёлета службы занятасці ўжо арганізавалі прафпадрыхтоўку шасці тысяч чалавек), дабіцца субсідыі на адкрыццё ўласнай справы, перабрацца ў іншы рэгіён. Але што там, гэта ж нашмат складаней, чым чакаць наймальніка, які сам цябе знойдзе і возьме такім, які ёсць...

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
*lubneuskaya@zviazda.by*

## АФІЦЫЙНА

Па інфармацыі камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінгарвыканкама, на пачатак года ў сталіцы налічвалася амаль 2,5 тысячы беспрацоўных. У верасні колькасць незанятых грамадзян вырасла ў 2,6 раза: цяпер на ўліку стаіць 6,6 тысячы чалавек. Найбольш зваротаў у службу занятасці назіралася ў чэрвені (у гэтым месяцы зарэгістравацца прыйшлі 2,3 тысячы беспрацоўных), аднак ужо ў жніўні колькасць ахвотных стаць на ўлік зменшылася на трэць, да 1,4 тысячы чалавек.

Максімальны тэрмін рэгістрацыі ў якасці беспрацоўнага — тры гады. Дапамога, на якую мае права незаняты грамадзянін, — да 360 тысяч у месяц. Сітуацыі, калі чалавека могуць зняць з уліку, прапісаны ў артыкуле 25 Закона «Аб занятасці насельніцтва Рэспублікі Беларусь». Напрыклад, калі беспрацоўны не прыходзіў больш за тры месяцы ў органы дзяржаўнай службы занятасці без уважлівых прычын ці адмовіўся ад дзвюх прапанаваных вакансій (або двойчы не захацеў праходзіць прафесійную падрыхтоўку). На ўліку не будуць трымаць і тых, хто падманам спрабаваў атрымаць дапамогу па беспрацоўі, быў асуджаны па прыгаворы суда да папраўчых работ, арышту, абмежавання ці пазбаўлення волі, грамадзян, накіраваных у лячэбна-працоўныя прафілакторыі.

У 2015-м сталічным камітэтам па працы, занятасці і сацыяльнай абароне заключана 144 дагаворы аб парадку арганізацыі і ўмовах правядзення грамадскіх работ, якія аплачваюцца, з наймальнікамі розных форм уласнасці і відаў дзейнасці. Калі чалавек, што стаіць на ўліку, адмаўляецца выходзіць на работы, то выплата дапамогі па беспрацоўі прыпыняецца на тэрмін да трох месяцаў.

**Каментарый да тэмы**

## ПАРЛАМЕНТАРЫЙ: «МЫ МУСІМ БЫЦЬ САЦЫЯЛЬНА АДКАЗНЫМІ»

**Жанна МІШУР, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па працы і сацыяльных пытаннях, дэпутат ад Бабруйска-Першамайскай выбарчай акругі №79 (Магілёўская вобласць):**

— У мяне ў акрузе людзей, якія не жадаюць працаваць, не шмат. Напэўна, менталітэт беларусаў не прымае нахлебніцтва. Большасць бабруйчан разважае так: калі дзяржава нешта робіць для нас, то і мы павінны нешта зрабіць для дзяржавы. Людзі разумеюць, што мы жывём у квітнеючай краіне, дзе пануе мір і стабільнасць, і кожны адчувае свой унёсак у такое становішча.

Калісьці мы будавалі камунізм, чакалі, што ўсе даброты будзем атрымліваць бясплатна. Але такога не бывае. Законы рынку дыктуюць зусім іншы падыход да жыцця. Гэта тычыцца і сацыяльных гарантый. Людзі, з якімі я сустракаюся ў акрузе, падтрымліваюць палітыку нашай дзяржавы, накіраваную на пераадоленне ўтрыманства ў грамадстве.

Я прапрацавала дырэктарам школы 15 гадоў. Мае дзеці ў школе... Я лічу іх сваімі дзецьмі, а іх было ў розныя гады ад 1000 да 1300 чалавек, яны ведалі: нічога задарма не бывае. Трэба працаваць, нечага дамагчыся. Жадаеш жыць прыстойна — працуй.

Зразумела, ёсць і такія, хто працаваць не жадае. Ёсць тыя, хто працуе на сябе і не плаціць падаткі, але, калі наступае пенсійны ўзрост, чалавек атрымлівае сацыяльную пенсію, якую яму зарабляюць іншыя людзі. Ці справядліва гэта?

Досыць паказальная тут сітуацыя з жанчынамі, якія выхоўваюць дзяцей. Яны атрымліваюць дапамогу ад дзяржавы, і дапамогу важкую. Але, як толькі дзеці падрастаюць, большасць жанчын ідзе працаваць. І гэта, лічу, правільна.

Думаю, пасля ўвядзення збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў для тых, хто не плаціць падаткі, людзі яшчэ больш задумаліся. І паглядзіце: афіцыйна беспрацоўныя знаходзяць 3 мільёны 600 тысяч рублёў, значыць, яны зарабляюць. Я падтрымліваю рамеснікаў, якія зарабляюць грошы сваёй працай: вараць сыры, плятуць кашы... Але тых, хто часцяком заглядае ў чарку, для каго жыццё — гэта толькі выпіўка, варта прымушаць працаваць.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.** *medvedeva@zviazda.by*

**Падрабязнасці**

## НАВУЧАННЕ АДНАГО БЕСПРАЦОЎНАГА АБЫХОДЗІЦЦА МІНПРАЦЫ Ў 3,7 МІЛЬЁНА РУБЛЁЎ

**Прафесійную перападрыхтоўку незанятых грамадзян арганізоўваюць па найбольш запатрабаваных спецыяльнасцях. Як і раней, гэта рабочыя профілі (яны складаюць 61 працэнт ад агульнай масы вакансій). Рынку працы не хапае кандытараў, кантралёраў-касіраў, кухараў, электраманцёраў. Сярод спецыялістаў і служачых запатрабаваны акушэркі, выхавацелі дашкольных устаноў, фельчары, інжынеры-праграмісты. Сельская мясцовасць чакае жывёлаводаў, аператараў машыннага даення, трактарыстаў, аграномаў, ветурачоў.**

— Навучанне беспрацоўнага праводзіцца, калі немагчыма падабраць чалавеку вакансію праз адсутнасць неабходнай кваліфікацыі ці калі ў грамадзяніна ўзніклі супрацьпаказанні да выканання работ па той прафесіі, якую ён мае, — каментуе **начальнік упраўлення палітыкі занятасці Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Алег ТОКУН**. — Сёлета 40 працэнтаў рабочых падрыхтавана намі па заяўках наймальнікаў. Асаблівую ўвагу надаём моладзі.

Летась сярэдні кошт навучання аднаго беспрацоўнага склаў 3,7 мільёна рублёў. Але гэтыя выдаткі пакрывае Мінпрацы, для самога чалавека курсы бясплатныя. Больш за тое, на перыяд праходжання прафадукацыі беспрацоўнаму гарантуецца стыпендыя ў памеры ад адной да трох базавых велічынь (сума залежыць ад прычыны звальнення). Калі перападрыхтоўка праходзіць не па месцы жыхарства, кампенсуюць таксама затраты на праезд і пражыванне.

Беспрацоўны, якому прапануюць запісацца на пераадукацыю, мае выбар больш чым са 120 прафесій (80 працэнтаў з іх — рабочыя спецыяльнасці). Апошнім часам арганізоўваецца навучанне па інтэграваных профілях, калі чалавек адразу можа атрымаць дзве-тры сумежныя прафесіі. Ёсць нават курсы па перападрыхтоўцы на базе вышэйшай адукацыі (беспрацоўныя могуць прайсці іх, напрыклад, у Рэспубліканскім інстытуце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі работнікаў Міністэрства працы і сацыяльнай абароны). Вялікім попытам у незанятых грамадзян карыстаюцца трохтыднёвыя праграмы па прадпрымальніцкай дзейнасці.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.** *lubneuskaya@zviazda.by*

**РУП «Институт недвижимости и оценки» извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего РУП «Белтелеком» на праве хозяйственного ведения**

| № лота | Наименование | Адрес | Начальная цена с НДС, руб. | Задаток, руб. |
|---|---|---|---|---|
| Лот №1 | Терминал WLL T-100F (с факсом), 66 штук | г. Гомель, пр-т Ленина, 1 | 7 328 640 | 366 432 |
| Лот №2 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 670 штук | г. Гомель, пр-т Ленина, 1 | 34 463 760 | 1 723 188 |
| Лот №3 | WLL-терминал (без факса) T-100, 4 120 штук | г. Минск, ул. Стебенева, 10 | 181 252 320 | 9 062 616 |
| Лот №4 | WLL-терминал (без факса) T-100, 1 350 штук | г. Минск, ул. Стебенева, 10 | 63 959 520 | 3 197 976 |
| Лот №5 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 1 110 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 52 588 800 | 2 629 440 |
| Лот №6 | WLL-терминал T-100F (с факсом), 40 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 4 159 680 | 207 984 |
| Лот №7 | Терминал фиксированный беспроводной связи стандарта IMT MC-450 ETS-1000, 2 штук | г. Могилев, ул. Ленинская, 12 | 126 720 | 6 336 |
| Лот №8 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 25 штук | г. Минск, ул. Захарова, 57 | 1 692 000 | 84 600 |
| Лот №9 | Терминал - WLL T-100 (без факса), 8 штук | г. Минск, ул. Захарова, 57 | 507 120 | 25 356 |

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект (Объекты) по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов) – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта (Объектов) в течение 10 (десяти) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона.

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан оплатить всю стоимость приобретенного на аукционе Объекта (Объектов) в течение 5 (пяти) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи Объекта (Объектов) за вычетом внесенной им суммы задатка (задатков).

Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона на основании счета-фактуры в течение 3 (трех) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Информация о затратах доводится до сведения участников до начала проведения аукциона по каждому Объекту, выставляемому на аукцион.

На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством Республики Беларусь для Победителя аукциона.

Размер штрафа, уплачиваемый участником аукциона и (или) его Победителем (Претендентом на покупку) в случаях, предусмотренных Положением о порядке организации и проведения аукционов (конкурсов) по продаже отдельных объектов, находящихся в государственной собственности, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 12.07.2013 №609 (далее – Положение) и соглашением о правах и обязанностях сторон в процессе организации и проведения аукциона, составляет 10 000 000 рублей.

Аукцион состоится **29.09.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Шаг аукциона – 5%. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 25.09.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.
Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества РУП «Белтелеком» (Лот №__), **проводимом 29 сентября 2015 г.**
Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Рэспубліка» от 27.03.2015. С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **www.ino.by.**

**☎ Организатор: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

**РУП «Институт недвижимости и оценки» (Организатор аукциона) извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества ОАО «Оргпищепром» (Продавец):**

**производственный корпус с инв. № 640/С-84599, здание проходного пункта с инв. № 640/С-84600, асфальтное покрытие с инв. № 640/С-87556, забор сетчатый с двумя воротами с инв. № 640/С-87555,**

**расположенные по адресу:**

**Минская обл., Слуцкий р-н, г. Слуцк, ул. Заводская, 1А/1, 1А.**

Часть производсвтенного корпуса с инв. № 640/С-84599 сдается в аренду: 60,9 кв.м по 16.11.2015, 45,0 кв.м по 23.11.2017.

Земельный участок площадью 0,5904 га с кадастровым номером 624650100001001747. Целевое назначение – содержание и обслуживание Слуцкого производственного участка. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь.

**Начальная цена с НДС – 2 136 980 231 бел. руб.**
**Задаток – 200 000 000 бел. руб. Шаг аукциона – 5%.**

*Задаток перечисляется на р/с №3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк» ЦБУ №703, 220004, г. Минск, ул. Кальварийская, д. 4а, код 369. Получатель – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182. Назначение платежа: задаток для участия в повторном аукционе по продаже имущества ОАО «Оргпищепром»,* **проводимом 14 октября 2015 г.**

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона. Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта (Объектов): 50% в течение 5 календарных дней с момента подписания договора; 50% в течение 60 календарных дней с момента подписания договора. Победитель аукциона (Претендент на покупку) оплачивает Организатору аукциона вознаграждение в размере 3% (трех процентов) от цены продажи Объекта (Объектов) в течение 3 (трех) банковских дней со дня подписания протокола о результатах аукциона. На Претендента на покупку распространяются правила и условия, установленные законодательством для Победителя аукциона.

Аукцион состоится **14.10.2015 в 11.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 4. Заявления на участие и необходимые документы принимаются **по 12.10.2015 до 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Комсомольская, д. 11, 3 этаж, каб. 6.

*Первое полное извещение о проведении аукциона опубликовано в газете «Звязда» от 16.06.2015.* С полным текстом извещения можно ознакомиться на сайте Организатора аукциона **ino.by.**

**☎ Дополнительная информация: 8 (017) 306-00-57, 8 (029) 356-90-03, 8 (029) 550-09-52 • www.ino.by • e-mail: torgi@ino.by**

## ПРЕДЛОЖЕНИЕ О ПОКУПКЕ АКЦИЙ

Полное наименование, место нахождения и контактный телефон покупателя акций: **Открытое акционерное общество «ОРГСТРОЙ»; 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Берестянская, 16; 8-017-294-30-29.**

Полное наименование, местонахождение эмитента, акции которого приобретаются: **Открытое акционерное общество «ОРГСТРОЙ»; 220034, Республика Беларусь, г. Минск, ул. Берестянская, 16.**

Цель приобретения акций, определенная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении: **аннулирование.**

Количество акций, которое намеревается приобретать покупатель: **805 (восемьсот пять) штук.**

Фиксированная цена покупки акций, установленная общим собранием акционеров, на котором было принято решение о таком приобретении: **150 000 (сто пятьдесят тысяч) белорусских рублей за одну штуку.**

Срок, форма и порядок оплаты акций: **оплата приобретаемых акций осуществляется покупателем в срок не позднее 10 (десяти) рабочих дней, следующих за днем зачисления акций на счет «депо» покупателя, путем выдачи продавцу акций наличных денежных средств (белорусских рублей) через кассу покупателя или путем безналичного перечисления денежных средств (белорусских рублей) на банковский счет продавца акций.**

Адрес, по которому будут заключаться договоры купли-продажи акций: **г. Минск, проспект Машерова, 29, депозитарием ОАО «Белинвестбанк».**

Дата начала срока представления предложений акционеров о продаже акций: **18 сентября 2015 года.** Дата окончания срока представления предложений акционеров о продаже акций: **25 сентября 2015 года.**

Дата начала покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций): **28 сентября 2015 года.** Дата окончания покупки акций (заключения договоров купли-продажи акций): **27 октября 2015 года.**

Наблюдательный совет

УНП 100029434

Страховой полис по добровольному страхованию от болезней и НС на время поездки за границу серии БА № 0585802-0585806 (5 шт.), БА № 0641918-0641962 (45 шт.); карта международного моторного страхования «Зеленая карта» серии BY07 № 08835713-08835722 (10 шт.); страховые полисы (Универсальные) серии ПЕ № 0185982-0185986 (5 шт.); страховые полисы по обязательному страхованию ГО владельцев ТС на территории РБ серии ВА № 0017478-0017485 (8 шт.); ВА № 2019451-2019452 (2 шт.); страховые полисы комб. жилищн. страх. серии ПК № 010833-010837 (5 шт.) страховой компании ЗАСО «Промтрансинвест» **считать недействительными в связи с утерей.**

## Общество с ограниченной ответственностью «Юридическая компания Аспект» проводит первые повторные ОТКРЫТЫЕ ТОРГИ в форме аукциона по продаже имущества ликвидируемого частного производственно-торгового унитарного предприятия «Альбус»

| № лота | Наименование лота (предмета торгов) | Начальная цена лота (без НДС), руб. | Шаг торгов, руб. | Задаток для участия в торгах, руб. |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Здание специализированное для производства текстильных, швейных и кожаных изделий (швейный цех), инв. № 210/С-11122, 1978 г.п., площадью 924,4 кв.м, расположенное по адресу: Витебская область, г. Браслав, пер. Песчаный, д. 8 на арендуемом земельном участке с кадастр. № 220850100020000002 площадью 0,2281 га. | 769 158 000 | 38 457 900 | 76 915 800 |

| | |
|---|---|
| **Продавец** | **Частное производственно-торговое унитарное предприятие «Альбус»** |
| **Организатор торгов** | **ООО «Юридическая компания Аспект»** |
| **Место проведения торгов** | **г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж)** |
| **Время проведения торгов** | **05.10.2015 в 14.00** |
| **Срок подачи заявок** | **по 30.09.2015** |
| **Порядок подачи заявок** | **на почтовый адрес организатора торгов: 220050, г. Минск, а/я 85** |
| **Срок внесения задатка** | **по 30.09.2015** |
| **Реквизиты для оплаты задатка** | **ЧПТУП «Альбус», р/с 3012034245019 в ЦБУ №205 ф-ла №214 ОАО «АСБ Беларусбанк», код 660, г. Браслав, УНП 390506973** |

**Условия торгов:**

• к участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке;

• для участия в торгах организатору торгов представляются следующие документы:

- *юридическим лицом:* копии последней редакции устава и свидетельства о государственной регистрации вместе с их подлинниками для заверения копий организатором аукциона, доверенность представителю юридического лица или документ, подтверждающий полномочия руководителя юридического лица; юридическим лицом, иной организацией (нерезидентом Республики Беларусь) копии учредительных документов представляются вместе с выпиской из торгового реестра страны их учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до даты подачи заявления) или иным равнозначным доказательством юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения, а также доверенностью на своего представителя, легализованные в установленном порядке, с нотариально удостоверенным переводом на русский язык;

- *индивидуальным предпринимателем:* копия свидетельства о государственной регистрации и подлинник для заверения копии организатором аукциона;

- *представителем гражданина Республики Беларусь, индивидуального предпринимателя:* нотариально удостоверенная доверенность;

- *представителем иностранного физического лица, индивидуального предпринимателя (нерезидентов Республики Беларусь):* легализованная в установленном порядке доверенность с нотариально удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

Помимо указанных документов вышеперечисленными лицами представляется оригинал документа, подтверждающего внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет ПРОДАВЦА, указанный в настоящем извещении.

• Победителем признается участник торгов, предложивший наиболее высокую цену;

• заключение договора купли-продажи осуществляется в течение 10 (десяти) рабочих дней со дня проведения торгов;

• победителю торгов, выразившему согласие на заключение договора купли-продажи, задаток не возвращается и учитывается при окончательных расчетах за приобретение предмета торгов;

• победитель торгов оплачивает цену лота **с учетом НДС**, за вычетом суммы внесенного задатка, в течение 10 (десяти) календарных дней с момента заключения договора купли-продажи;

• в случае отказа (уклонения) победителя торгов, единственного участника торгов от подписания протокола о результатах торгов, возмещения затрат на организацию и проведение торгов, подписания договора, а также в иных случаях, предусмотренных актами законодательства, внесенный этим участником задаток возврату не подлежит;

• в случае, если торги признаны несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником, предмет аукциона продается претенденту на покупку, при его согласии, по начальной цене, увеличенной на 5 (пять) процентов.

**Получить дополнительную информацию о порядке проведения торгов, а также ознакомиться с документацией по предмету торгов можно по телефонам: +375 (44) 5986627, 8(017)2130699 либо по адресу: г. Минск, ул. Ольшевского, д. 22, пом. 6, оф. 20 (-1 этаж).**

# ПРАВИЛА ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ «В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!»

**Настоящие Правила проведения рекламной игры (в дальнейшем – Правила), направленной на продвижение и увеличение продаж товаров СООО «Волшебный остров», разработаны в соответствии с Положением о проведении рекламных игр на территории Республики Беларусь, утвержденным Указом Президента Республики Беларусь от 30.01.2003 № 51 (с изменениями и дополнениями) и определяют порядок проведения рекламной игры «В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!» (далее – Игра).**

**1. Организатор**

Организатором Игры является Совместное общество с ограниченной ответственностью «Волшебный остров» (далее по тексту – Организатор), зарегистрированное Минским горисполкомом от 01.10.2010 в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 690455676. Юридический адрес: Республика Беларусь, 222827, Минская обл., Пуховичский р-н, г. Марьина Горка, ул. Новая Заря, д. 49, комн. 2, тел.: (37517) 503-15-86, 503-15-87, 503-15-88, 503-15-90, тел./факс 503-15-70. УНП 690455676.

Игра осуществляется в соответствии с настоящими Правилами с соблюдением требований законодательства Республики Беларусь.

**2. Наименование Игры**

Наименование Игры: «В мир детства с MOMMY LOVE и ГИППО!».

**3. Участники Игры**

Участниками Игры являются физические лица – граждане Республики Беларусь, независимо от возраста, постоянно проживающие на территории Республики Беларусь, и лица, имеющие вид на жительство на территории Республики Беларусь и постоянно в ней проживающие, выполнившие условия участия в Игре.

В Игре не имеют права участвовать лица, состоящие в трудовых отношениях с Организатором Игры, супруг (супруга) такого лица, его близкие родственники, а также лица, находящиеся с таким лицом в отношениях свойства.

**4. Срок проведения Игры**

Игра проводится в период (далее по тексту – «Срок проведения Игры») **с 01 октября 2015 г. по 23 декабря 2015 г.** (включая период розыгрыша и выдачи призов).

**5. Наименование товаров, в целях стимулирования реализации которых проводится Игра**

В рекламной игре участвуют товары торговой марки «Mommy Love» поставщика СООО «Волшебный остров», представленные в магазинах «ГИППО» (см пункт №6) (далее – Товар, участвующий в Игре).

**6. Территория проведения Игры**

Игра проводится в магазинах «ГИППО» на территории Республики Беларусь в городах Минск, Гомель, Гродно, Могилев, расположенных по адресам:

| Название юридического лица | Город | Адрес |
|---|---|---|
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | пр-т Рокоссовского, 2 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ул. Горецкого, 2 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ул. Городецкая, 30 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | Игуменский тракт, 30 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ул. Сухаревская, 31 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ул. Жуковского, 3 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ул. Червякова, 57 |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | Минский р-н, д. Боровая (1 км от кольцевой в сторону Логойской трассы) |
| ИУП «БелВиллесден» | Минск | ТЦ «МОМО» возле ст. м. Могилевская |
| ИУП «БелВиллесден» | Могилев | ул. Мовчанского, 6 |
| ИУП «БелВиллесден» | Гомель | ул. Косарева, 18 |
| ИУП «БелВиллесден» | Гродно | ТЦ «OldCity» ул. Дубко, 17 |

**7. Призовой фонд Игры:**

| Вид приза | Наименование | Ед. измерения | Кол-во | Цена за единицу без НДС, бел. руб. | Всего без НДС, бел. руб. |
|---|---|---|---|---|---|
| Приз первого уровня | 10558 Считай и играй 35*19*9 | шт | 15 | 153 798 | 2 306 970 |
| Приз второго уровня | ZAZ01\M Зайка-Знайка | шт | 30 | 214 080 | 6 422 400 |
| Приз третьего уровня | KR-7748 Круг для купания малышей | шт | 100 | 31 648 | 3 164 800 |
| | Итого: | | | | 11 894 170 |

Призовой фонд Игры сформирован за счет имущества Организатора в размере 11 894 170 (одиннадцать миллионов восемьсот девяносто четыре тысячи сто семьдесят) белорусских рублей.

**8. Порядок участия в Игре**

8.1. Для того чтобы принять участие в Игре, необходимо в период **с 01 октября 2015 г. по 30 ноября 2015 г. включительно** выполнить следующие условия:

